№ 17 (519) 11 траўня 2007 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы

# Прэзыдэнт Францыі — наш зямляк

У Элізэйскім палацы засядзе цэнтральнаэўрапеец. Старонка 15.



REUTERS

## Аўтазакі ў Дзень перамогі

Колькі жыву ў Менску, а такой карцінкі 9 Траўня дагэтуль ніколі ня бачыў. Ад самай раніцы Сьвіслач у раёне парку Горкага і Купалаўскага сквэру расьсякалі маторкі з байцамі МНС на борце. Яны былі ў ратавальных камізэльках, а ў некаторых чаўнах было відаць акваляні.

Найбольш запомніўся саліднага выгляду лысаваты чалавек у чорным строі і ў гальштуку, які на водным ровары курсаваў уздоўж берагу. Ягоных калегаў у чорным было шмат па ўсёй набярэжнай — на іх са зьдзіўленьнем паглядалі рэдкія бегуны ад інфаркту ды ўладальнікі сабакаў, што вывелі сваіх гадаванцаў гуляць.

Асабліва шмат людзей у цывільным — то бок у аднолькавых чорных куртках — было ў аўтобусах каля будынку тэлебачаньня на Камуністычнай. Сама вуліца была перакрытая для аўтамабільнага руху ад Чырвонай.

І гэта ўсе зразумець яшчэ можна — бясьпека кіраўніка дзяржавы ў спэцслужбаў кожнага дня на першым месцы. Але навошта там стаялі аўтазакі?

Мо ўлады чакалі ад сівых вэтэранаў спробаў узяць штурмам АНТ? Ці баяліся бунту расейскамоўнага насельніцтва, як у Таліне?

Са сьвятам, сябры!

**Віталь Тарас**

### Крымскія сюжэты

Піша Сяргей Харэўскі.

**Старонка 24.**



## У нумары


### люстра дзён

Спроба №4 ........ 4

Шэсьце інвалідаў–вазочнікаў да Адміністрацыі прэзыдэнта 5

Выкраданьне беларускі ў Нігерыі ........ 5

Мілінкевіч сустрэўся з прэзыдэнтам Польшчы ........ 6

Лукашэнка: Захад адстойвае драпежніцкія эканамічныя інтарэсы ........ 6

«Статус беларусаў ня будзе розьніцца ад статусу чукчаў» 6

«Фашиствующие руководители, уймитесь» ...... 7

Яшчэ адну беларускую арганізацыю зьнішчылі ........ 7

Эрык Сійгур: Што камэнтаваць, калі бачыш партрэт Сталіна . 8

Рэфэрэндум і бульдозэры ... 14

### камэнтары

Віталь Тарас. Пераключаючы каналы ........ 10

Павал Севярынец. Бацькі, дзеці і судзьдзі ........ 12

Аляксандар Класкоўскі. Цэнтральнаэўрапеец прэзыдэнтам Францыі ........ 15

Аляксандар Фядута. Перанос ........ 17

### пошта рэдакцыі

Што рабіць, калі заганяюць у прафсаюз ........ 18

### культура

Альбом памяці 2006 году .... 20

### газэтка дзеткам

Цырульня ........ 28

### дзе варта быць

Выстава Людвіка Асецкага, адбор на «Басовішча», найдаражэйшы фільм у сьвеце ........ 30

### комікс

Бульбман вяртаецца ........ 31


## Зьбяры «Кнігарню «Наша Ніва»




**Найясьнейшая Рэч Паспалітая:** Цывілізацыя–Культура–Рэлігія–Палітыка–Авантура–Героіка–Успамін / Укладальнік Алег Дзярновіч. — Менск: І. П. Логвінаў, 2007. — (Кнігарня «Наша Ніва»)

# Міжнародная прэмія за акрэсьцінскі дзёньнік

Рэдактар сайту nn.by уганараваны прэміяй імя Лёрэнца Наталі.

Андрэй Дынько стаў ляўрэатам прэміі імя Лёрэнца Наталі за 2006 год. Прэмія прысуджаецца за найлепшы артыкул. Дынько стаў першым у гісторыі прэміі цэнтральнаэўрапейскім журналістам, уганараваным ёю. Дагэтуль сярод эўрапейцаў узнагароду атрымлівалі толькі аўтары з заходняй часткі кантынэнту.

Гэта міжнародная ўзнагарода для пішучых журналістаў. Прысуджаецца яна за артыкул, напісаны цягам мінулага году, які чапляе праблемы абароны дэмакратыі і правоў чалавека.

А.Дынько быў намінаваны за свой акрэсьцінскі дзёньнік. Ён напісаў яго ў сакавіку 2006 г. і перадаў на волю. Твор быў апублікаваны ў «Нашай Ніве» яшчэ да таго, як Дынько выйшаў на свабоду. Пад загалоўкам «Тэрапія ахвярнасьцю. Ліст зь менскай турмы» яго пераклалі на восем эўрапейскіх моваў. Ён быў апублікаваны ў такіх значных выданьнях, як «Франкфуртэр альгемайнэ цайтунг», «Рэспэкт», eurozine. com. Празь яго ўдалося наноў зьвярнуць увагу сьвету на Беларусь.

Сёлета на прэмію прэтэндавалі 1529 пісьменьнікаў і журналістаў са 165 краінаў з усіх кантынэнтаў.

Цырымонія ўзнагароджаньня адбываецца ў прэс-цэнтры Эўракамісіі ў Брусэлі, у Дзень свабоды прэсы.

Гран-пры атрымала Лі Сю Інг з англамоўнай газэты Ганконгу за рэпартаж пра бунт супраць карумпаванага старшыні сельсавету ў вёсачцы на поўдні Кітаю.

Першая прэмія ў эўрапейскім рэгіёне адышла журналісту з Шатляндыі. Ён зрабіў рэпартаж пра ўмовы працы будаўнікоў у Дубаі. Другая — Андрэю Дыньку. Трэцяя — рэпарцёру «Шпігелю». Ён тайна перайшоў мэксыканска-амэрыканскую мяжу разам зь нелегальнымі мігрантамі.

«Ёсьць іронія ў тым, што я сядзеў на Акрэсьціна ў корпусе, збудаваным на грошы эўрасаюзаўскай праграмы TACIC. А цяпер за рэпартаж пра гэта атрымліваю эўрасаюзаўскую прэмію, — казаў на цырымоніі А.Дынько. — Быў холад у камэрах, тлум. Дзевяць чалавек на пяць нараў. Удзень гамарня, дым. Не было як засяродзіцца. Таму пісаў уначы. І вось — людзі адчулі тое, што перажылі беларусы».

Сярод іншых матэрыялаў-пераможцаў — артыкул пра зьнікненьні людзей у Пакістане, нарыс пра ахвяраў грамадзянскае вайны ў Калюмбіі, гісторыя самалійскага хлопчыка, які ўцёк ад вайны і ўрэшце апынуўся ў Чылі, і паўднёваафрыканскага актывіста, якога ў часы апартэіду несправядліва зьвінавацілі ў забойстве — рыхтык, як Паўла Красоўскага.

За цырымоніяй сачыў беларускі дыплямат. Ён сышоў з залі, не павітаўшыся і не павіншаваўшы.

**Ул.інф.**

# Невядомая вайна

Піша Аляксандар Класкоўскі.

Вось і на адкрыцьці бюста Жукава ў Менску прагучала, што маршал Жукаў прыняў капітуляцыю фашыстоўскай Нямеччыны. Але ж фактычна гэта быў, кажучы мовай кіношнікаў, дубль два. Насамрэч Райх капітуляваў у французскім Рэймсе днём раней. Таму на Захадзе Дзень перамогі над нацыстамі сьвяткуюць 8-га, на дзень раней, чым заведзена ў нас.

Ды хіба ж мог Сталін зьмірыцца з тым, што гітлерцы здаліся нейкім янкі? Таму Масква дамаглася, каб тую капітуляцыю лічылі «папярэдняй». А ў ноч на 9 траўня ў Бэрліне зладзілі імпрэзу ўжо з удзелам савецкага маршала. Заходнія саюзьнікі дыпляматычна назвалі яе «ратыфікацыяй».

А вось роля Жукава ў апэрацыі «Багратыён» болей сьціплая, чым заведзена маляваць. Зь ліпеня 44-га ён кіраваў апэрацыяй ва Ўкраіне, а тут вялі рэй іншыя сталінскія палкаводцы. Зрэшты, гарматнага мяса не шкадавалі гэтак сама. Асабліва тых беларусаў, якіх забралі ў Чырвоную Армію пасьля вызваленьня. Як жа, пад акупацыяй былі! Кепска падрыхтаваныя часткі бяз роздуму кідалі ў пекла.

У адным зь першых баёў загінуў і мой дзед Ёсіф. Ведаю яго па гэтым вось даваенным яшчэ здымку, зробленым падчас вайсковых збораў. У 44-м дзеда мабілізавалі, далі кулямёт. Другім нумарам прызначылі сваяка з суседняй вёскі — дзядзьку Юзю. Таму пашанцавала вярнуцца з фронту. Распавядаў: «Ёсіф упаў, як падкошаны, калі, адбіўшы атаку, перабягалі на запасную пазыцыю. Але пасьля бою цела так і не знайшлі. Дый ці надта быў клопат? Пазначылі ў паперах стандартнае «прапаў бязь вестак».

Вось так: маршалам — зоркі ды манумэнты, а мільёнам простых салдатаў, чыёй крывёю здабываліся перамогі, нават радка на абеліску не дасталося.

На вайне як на вайне. Але ці былі непазьбежнымі ўсе тыя шматмільённыя ахвяры? Ці не кашчунна называць дальнабачнай палітыкай перадваенныя гулі зь фюрэрам, уключна з пактам Молатава-Рыбэнтропа ды савецка-нацысцкім парадам у Берасьці? Зрэшты, паводле бесчалавечнасьці дзьве таталітарныя сыстэмы стаялі побач. Мой прадзед Вацлаў, напрыклад, трапіў у Сібір за неасьцярожнае выказваньне пра калгасны лад... Савецкая ўлада і без усялякай вайны мільёнамі сьцірала ў пыл насельнікаў уласнай краіны. У тым ліку, як вядома, была вынішчана і кадравая эліта Чырвонай Арміі.

Між тым і сёньня айчыннае начальства ўпарта чапляецца за міталёгію. І прымнажае яе рознымі «лініямі Сталіна».

Дарэчы, я сам родам з тых мясьцінаў на ўсход ад Радашкавічаў, дзе праходзіла паласа ўмацаваньняў, пабудаваная на былой мяжы з Польшчай. Дзецьмі гулялі ў вайну, шастаючы па тых дотах. Старэйшыя вяскоўцы распавядалі, што немцы прайшлі скрозь УР («умацаваны раён») як нож скрозь масла. Трохі далей, пад Астрашыцкім Гарадком, 100-я дывізія Русіянава сапраўды дала гітлерцам дыхту. Але гэта ўжо зь іншай опэры. Ва ўсякім разе, гэта было зусім ня там, дзе летась бегаў са сьцягам імпульсіўны Уга Чавэс. І ў любым выпадку тое, што ўжо 26 чэрвеня 1941 году немцы дапялі да Менску, — факт.

За нязручную, жорсткую праўду пра вайну так не любілі ў важных кабінэтах Васіля Быкава. Маўляў, ня трэба ачарняць подзьвіг салдата! Але ад поўнай праўды пра вайну подзьвіг простага салдата зусім ня гасьне. Блякнуць міты пра мудрага генэралісімуса ды ягоных палкаводцаў.

Так што цяперашнія начальнікі зь іх ідэалягічнымі рэфрэнамі («не дамо рабіць замах на гісторыю!») бароняць ня столькі салдацкую славу, колькі свайго вусатага куміра-генэралісімуса ды ягоны бесчалавечны лад. Бароняць фальшывую індульгенцыю: маўляў, няма чаго нам правамі чалавека тыцкаць, бо мы Захад ад карычневай чумы вызвалілі! Можна падумаць, гэтыя дзеячы з партфэлямі і мажнымі каркамі самі штурмавалі райхстаг.


ФОТА З АРХІВУ АЛЯКСАНДРА КЛАСКОЎСКАГА


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**У Менску 8 траўня адкрылі бюст савецкага ваеначальніка Жукава.**




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Спроба №4

У панядзелак адбыўся Ўстаноўчы сход менскай гарадзкой арганізацыі «Малады фронт».

Гэта ўжо чацьвёртая спроба зарэгістраваць арганізацыю ад моманту яе ўзьнікненьня ў 1996 годзе. Тры першыя разы органы юстыцыі рэгістраваць арганізацыю адмаўляліся. Рашэньне аб рэгістрацыі прымалася з мэтай зацягнуць ці ўвогуле спыніць судовы працэс пяцёх «маладафронтаўцаў» (Хведарука, Палажанкі, Корбана, Янушэўскага і Гарэцкага), якіх абвінавачваюць у дзейнасьці ад імя незарэгістраванай арганізацыі.

Аховай Сходу кіраваў баранавіцкі хлопец Яраслаў Грышчэня, крымінальную справу якога прыпынілі толькі на днях. Быў зарэгістраваны 21 удзельнік сходу. Агулам на мерапрыемства прыйшло каля шасьцідзесяці чалавек. У асноўным — маладыя хлопцы і дзяўчаты. Сярод больш сталых гасьцей сходу былі кіраўнік аддзяленьня швэдзкага пасольства Стэфан Эрыксан, пісьменьніца Вольга Іпатава, мовазнаўца Зьміцер Саўка, палітык Юрась Зяньковіч.

У прэзыдыюме сядзелі Зьміцер Хведарук, Алег Корбан, Барыс Гарэцкі, Наста Палажанка і Дзяніс Лаеўскі. На ўсіх хлопцах былі апранутыя пінжакі і гальштукі. Нязвыкла было бачыць гэтых юнакоў у салідных дзелавых строях. Барыс Гарэцкі на гэта пажартаваў: «Не касьцюм ператтварае чалавека ў кабінэтнага змагара».

З уступным словам выступіў Гарэцкі, ён жа быў абраны старшынём Устаноўчага сходу. Барыс адзначыў, што сёньня за кратамі знаходзяцца трое лідэраў «Маладога фронту» — Павал Севярынец, Зьміцер Дашкевіч і Артур Фінькевіч. Разам з тым, улады не спыняюць перасьлед арганізацыі: яшчэ на пяці сябраў «МФ» былі заведзеныя крымінальныя справы. «Улады перасьледуюць ня толькі тых маладзёнаў, якія бяруць на сябе лідэрскую адказнасьць, але і шараговых сябраў «МФ», — адзначыў Гарэцкі. — Сёньняшні сход — гэта не стварэньне арганізацыі, а спроба яе зарэгістраваць. У любым выпадку «Малады фронт» працягне сваё існаваньне, з рэгістрацыяй ці безь яе». Яшчэ Гарэцкі сказаў, што такім чынам «МФ» хоча паказаць, што арганізацыя гатовая выконваць нормы Канстытуцыі і законы краіны.

Пасьля ўступнага слова Зьміцер Хведарук зачытаў зварот да сяброў Сходу ад лідэра апазыцыі Аляксандра Мілінкевіча.

Было прынятае рашэньне спробы рэгістрацыі пад назвай Моладзевае грамадзкае аб'яднаньне «Малады фронт». Быў зацьверджаны статут арганізацыі. Усё адбывалася ў строгай адпаведнасьці бюракратычным правілам.

Быў зацьверджаны сьпіс сябраў Управы «МФ», якая будзе рэгуляваць дзейнасьць «Маладога фронту», у яе ўвайшлі Людміла Атакулава, Барыс Гарэцкі, Алег Корбан, Кацярына Краснова, Настасься Лойка, Ўладзімер Сяргееў, Зьміцер Хведарук і Кірыл Шымановіч.

Рэвізорам арганізацыі было вырашана абраць Касю Галіцкую.

Падчас выбараў старшыні сэнсацыяў не адбылося. Ім стаў Зьміцер Хведарук, а намесьнікам — Алег Корбан. Хведарук пасьля абраньня быў нешматслоўны, але відавочна рады.

Праз пару хвілінаў пачаўся канцэрт, у якім узялі ўдзел Піт Паўлаў і Аляксандар Памідораў. Недалёка ад управы дзяжурыла машына БТ разам з журналістам Юр'ем Леднікам.

Ужо заўтра сябры «МФ» зьбіраюцца пайсьці ў Міністэрства юстыцыі, каб падаць дакумэнты на рэгістрацыю. Рашэньне дасьць адказ, ці варта праводзіць Устаноўчы сход рэспубліканскага «Маладога фронту».

**Зьміцер Панкавец**

# Мілінкевіч сустрэўся з прэзыдэнтам Польшчы

Унутрыпалітычная сітуацыя ў Беларусі, падтрымка рэпрэсаваных і вяртаньне пасла Польшчы ў Беларусь сталі тэмамі спатканьня. «Мы працягнем праграмы дапамогі студэнтам, выключаным з ВНУ, і людзям, звольненым з працы, — заявіў Лех Качынскі. — Польшча зробіць усё магчымае, каб Беларусь далучылася да Эўрасаюзу».



А.Мілінкевіч правёў таксама двухбаковыя перамовы зь міністрам замежных справаў Польшчы Ганнай Фатыгай і магчымым паслом у Беларусі сп. Літвінам.

**БТ**

# Лукашэнка: Захад адстойвае драпежніцкія эканамічныя інтарэсы

Аляксандар Лукашэнка ўзяў удзел у сьвяточным шэсьці з нагоды Дня Перамогі. З сынамі і ўнучкай прайшоў на чале калёны вэтэранаў ад Кастрычніцкай да плошчы Перамогі.

Выступаючы на Плошчы перамогі, А.Лукашэнка адзначыў: «цяперашнія прэтэндэнты на сусьветнае ўладарства спрабуюць выкарыстаць вайну ў якасьці інструмэнту замежнай палітыкі. Пры дапамозе сілы адстойваюць свае геапалітычныя і драпежніцкія эканамічныя інтарэсы, душаць тыя дзяржавы, якія сталі на незалежны шлях разьвіцьця. Пры гэтым прыкрываюць сваю сутнасьць ілжывымі словамі пра дэмакратыю, абарону правоў чалавека і свабоду».

А.Лукашэнка заявіў, што «гнеў і абурэньне выклікаюць ў нас глумленьне над героямі і ахвярамі войнаў, такія як дэмантаж помніку савецкаму войну-вызваліцелю ў Эстоніі і закрыцьцё польскімі ўладамі савецкай экспазыцыі ў музэі канцлягеру Асьвенцім».

**Паводле радыё «Свабода»**

# «Статус беларусаў ня будзе розьніцца ад статусу чукчаў»

Як расейскамоўныя палітычныя і культурныя дзеячы ставяцца да нядаўняга закліку Ўладзімера Парфяновіча і Леаніда Сініцына, каб Беларусь увайшла ў склад Расеі асацыяваным членам?

**Сяргей Скрабец, былы палітвязень і дэпутат палаты прадстаўнікоў:** «Папершае, у нас няма ніякіх эканамічных падставаў для такога кроку. Расея — гэта краіна рынкавай эканомікі, а ў Беларусі ў эканоміцы невядома што. Па-другое, юрыдычны аспэкт, Расея разам з ЗША і Вялікай Брытаніяй зьяўляюцца гарантамі нашага сувэрэнітэту. І нарэшце, па-трэцяе, на гэта няма ніякага маральнага права. Сотні тысяч беларусаў гінулі ў барацьбе за дзяржаўную незалежнасьць. Таму мы ня можам пра гэта гаварыць, хоць бы з павагі да гэтых людзей».

**Аляксандар Адамянц, філёзаф:** «Адназначна адмоўна. Гэты «Маніфэст» абсалютна супярэчлівы. З аднаго боку, яны за ўваходжаньне ў склад Расеі, з другога — гавораць пра дзяржаўны сувэрэнітэт. Надзеі на дэмакратызацыю Беларусі з дапамогай Расеі ня маюць пад сабой грунту».

**Міхаіл Марыніч, былы палітвязень і міністар:** «Кожны мае права на сваю пазыцыю. Разам з тым я лічу, што ініцыятыва Сініцына і Парфяновіча неэфэктыўная. Сёньня трэба думаць пра дзяржаўны сувэрэнітэт, а не пра яго страту. Лічу «Маніфэст» цалкам контрапрадуктыўным».

**Валер Фралоў, генэрал:** «Я добра ведаю гэтых хлопцаў, добра ведаю, што і хто стаіць за іхнымі заявамі. Лічу, што гэтыя прапановы — спроба неяк паўплываць на адзін зь міжнародных суб’ектаў, які здольны зьмяніць сытуацыю ў Беларусі, то бок на Расею. Гэта звычайная спроба набраць палітычныя пункты ў Расеі. Але гэтыя палітыкі не перасьледуюць скурныя інтарэсы, яны сапраўды зычаць лепшага нашай краіне. Асабіста я не падтрымліваю хлопцаў. Я за незалежную, сувэрэнную, дэмакратычную Беларусь, якая будзе мець добрыя адносіны з Расеяй. Уваходжаньне ў склад Расеі асацыяваным членам нічым ня будзе розьніць статус беларусаў ад статусу чукчаў ці буратаў. Бліжэйшым часам я зьбіраюся яшчэ паразмаўляць зь Сініцыным і Парфяновічам, каб пераканаць, што абраны імі шлях памылковы».

**Аляксандар Вайтовіч, былы прэзыдэнт Акадэміі навук і сьпікер Савету рэспублікі:** «Стаўлюся рэзка адмоўна. Так нельга рабіць, бо Парфяновіч і Сініцын фактычна прапаноўваюць парушыць беларускую Канстытуцыю і жыць у адпаведнасьці з Канстытуцыяй Расеі. «Маніфэст» сумбурны. Хлопцы не падумалі над тым, што робяць».

**Андрэй Суздальцаў, палітоляг:** «Кепска паставіўся. Беларускі народ заслужыў права жыць у сваім доме, у незалежнай краіне. Расея мусіць таксама паважаць гэты выбар беларусаў і нельга іх пазбаўляць такой магчымасьці. Той фармат інтэграцыі, які прапанавалі Парфяновіч і Сініцын, нежыцьцяздольны. Такі фармат, як асацыяваны член, мог быць актуальным у сярэдзіне 1990-х, але не цяпер».

**Запісаў Зьміцер Панкавец**

# Шэсьце інвалідаў-вазочнікаў да Адміністрацыі прэзыдэнта

5 траўня інваліды традыцыйна ладзяць Дзень пратэсту за роўныя правы і супраць дыскрымінацыі. Беларускія інваліды прасілі дазволу на мітынг ля Акадэміі навук, улады паслалі іх да чорта на рогі, на плошчу Бангалор. Абражаныя інваліда на вазках зладзілі пасьля мітынгу шэсьце да Адміністрацыі прэзыдэнта. І даехалі! Хоць міліцыянты папярэджвалі інвалідаў, што «за ўдзел у несанкцыянаваным шэсьці яны будуць пакараныя». А 13-й ля цырку спэцназ спыніў шэсьце. У двары падагналі аўтазакі. Але інвалідаў гэта не напалохала, і яны паехалі далей. Наступны раз спэцназ спыніў інвалідаў проста ля будынку Адміністрацыі. У выніку ім такі дазволілі перадаць пэтыцыю.


PHOTO.BYMEDIA.NET



## Выкраданьне беларускі ў Нігерыі

Праз урад Нігерыі працягваліся перамовы з выкрадальнікамі супрацоўніцы нафтавай кампаніі «Whassan Eurest Nigeria Limited» Ірыны Экпа-Ума. Брат выкрадзенай, Алег Гівойна, паведаміў, што прадстаўнікі кампаніі прапанавалі яму прыехаць у гэтую краіну, каб непасрэдна сачыць за падзеямі. Начальнік антытэрарыстычнага цэнтру КДБ Беларусі Алег Чарнышоў заявіў, што за выкрадзеную нельга плаціць выкуп. «Гэта параджае наступныя злачынствы падобнага кшталту», — сказаў ён. А.Чарнышоў таксама выказаў думку, што брату І.Экпа-Ума ня варта ехаць у Нігерыю.

## СЬЦІСЛА

### Расея дасьць крэдыт без заставы «Белтрансгазу»

Умовы выдачы расейскага крэдыту для Беларусі ня будуць прывязаныя да акцыяў ААТ «Белтрансгаз». Пра гэта паведаміў міністар фінансаў Мікалай Корбут. Паводле ягоных слоў, крэдыт на 1 мільярд даляраў Беларусь атрымае сёлета, 500 мільёнаў — у 2008 годзе.

**Паводле БЕЛТА**

### Прыляціць Ахмадзінежад

Прэзыдэнт Ірана Махмуд Ахмадзінежад наведае Беларусь у бліжэйшыя два тыдні. Пра гэта карэспандэнту БелТА паведаміў пасол Ірану ў нашай краіне Абдольхамід Фекры.

### Зьмены ў правапісе: ня зараз

Дэпутат Уладзімер Здановіч заявіў у інтэрвію «Звяздзе», што зьмены ў правапіс беларускай мовы, прапанаваныя камісіяй Міністэрства адукацыі, недасканалыя і маюць быць дапрацаваныя. На сёньня камісія палаты прадстаўнікоў яшчэ не прыняла канчатковага рашэньня аб далейшым лёсе праекту правілаў.

### Экзархат: Падставаў для перагляду закону «Аб свабодзе сумленьня» няма

Беларускі экзархат ня бачыць падстаў для перагляду закону «Аб свабодзе сумленьня». Клірык Сьвята-Пакроўскага прыходу сталіцы Аляксандар Шрамко, які далучыўся да кампаніі за зьмену закону, ня мае царкоўнага благаслаdensьня на ўдзел у ёй, заявіла прэс-служба БПЦ.

### Гавэл супраць

Былы прэзыдэнт Чэхіі Вацлаў Гавэл асудзіў вылучэньне кандыдатуры Беларусі на членства ў Радзе правоў чалавека ААН. 7 траўня за подпісам Гаўла апублікавана спэцыяльная заява.

## ЦЫТАТА


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Лукашэнка ўратаваў беларускую літаратуру

З інтэрвію Андрэя Хадановіча газэце «Товарищ»: «Вялікі шанец для літаратуры, каб у ёй засталіся людзі, якім патрэбная яна сама, сама паэзія, само беларускае слова [а ня людзі, якія займаліся літаратурай дзеля заробку]... Лукашэнка даў беларускай літаратуры шанец займацца сваёй справай і «быць больш, чым літаратурай».

# «Фашиствующие руководители, уймитесь!»

Кампартыя і БРСМ штодзённа пікетуюць консульства Эстоніі ў Менску.

Падыходжу да маладзёна, які трымае савецкі штандар, пытаюся, ці ён сапраўды за аднаўленьне СССР. «Ня ведаю, я там практычна ня жыў». — «Дык, а сьцяг тады для чаго?» — «Дзядуля папрасіў патрымаць». У гэты момант падлятае той самы дзядуля й пачынае расказваць, што абсалютна ва ўсіх былых краінах Саюзу выступаюць за яго ўзьяднаньне. Пазыцыя сталага чалавека мне ясная, а вось маладзёна не да канца разумею. «Дык ты таксама за тое, каб у нас быў Савецкі Саюз?» — не здаюся я. «Старэйшыя кажуць, што там добра жылося, таму, можа, і за...» Пасьля хлопец пачынае казаць, што кепска, канечне, што ў нас ня будзе сваёй хакейнай каманды. Праз пару хвілінаў ён аддае сьцяг назад дзядулю, а сам ідзе ўбок.

Вэтэран вайны паказвае хлопцам і дзяўчатам выразкі са старых газэт, тлумачыць, які менавіта помнік зьнесьлі, расказвае пра Эстонію. Адзін пацан пытаецца ў вэтэрана: «А Эстонія мяжуе зь Беларусьсю?»

Пакуль адна частка трымае пікет, іншыя адпачываюць на траве, паляць цыгарэты. Праз пэўны прамежак часу мяняюцца. Моладзь — навучэнцы індустрыяльна-пэдагагічнага каледжу. З раніцы яны пікетуюць, пасьля абеду ідуць на практыку. Пераконваюць мяне, што прыйшлі па сваёй волі.

Пытаюся ў дзяўчыны, якая трымае транспарант «Фашиствующие руководители Эстонии, уймитесь!», што яна разумее пад фашызмам. Кажа: тое, што адбываецца ў Эстоніі. Ізноў пытаюся: а што там адбываецца? Фашызм, кажа.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Пэнсіянэры пачынаюць крычаць на маладых, каб не размаўлялі з «бээнэфаўскім» журналістам. Падскокваюць кіраўнікі ячэек БРСМ, на любыя мае пытаньні адказваюць самі, не даючы выказацца іншым. Пытаюся, якую арганізацыю прадстаўляюць. Адказваюць, што ніякую, проста прыйшлі выказаць свае меркаваньні. А на працу ці вучобу моладзі ня трэба? Кажуць, што калі моладзі трэба выказаць свае погляды, то можна і прапусьціць заняткі.

Акцыі арганізоўвае праўладная Камуністычная партыя Беларусі. Да 10 траўня абяцаюць прыходзіць штодня. Эстонскае консульства выказала МЗС свой пратэст і прыпыніла выдачу візаў.

**Зьміцер Панкавец**

# Яшчэ адну беларускую арганізацыю зьнішчылі

«Беларускі літаратурны фонд», ва ўласнасьці якога знаходзіўся санаторый-прафілакторый «Іслач», быў ліквідаваны 3 траўня. Разгляд справы цягнуўся дзесяць хвілін. Варта адзначыць, што пазоў кіраўніцтва «Беллітфонду» атрымала толькі 2 траўня.

Кіраўніцтва арганізацыі тэрмінова накіравала ў суд хадайніцтва з просьбай перанесьці разьбіральніцтва. Падрыхтавацца за ноч было папросту немагчыма. Аднак суд адхіліў хадайніцтва.

Паседжаньне цягнулася 10 хвілінаў. «Беллітфонд» быў ліквідаваны. Судзьдзя Валеры Смалюк адзначыў, што рашэньне суду не падлягае абскарджаньню і ўсклаў задачу па ліквідацыі фонду на яго кіраўніцтва пад кантролем Мінʼюсту. Лёс санаторыя-прафілакторыя «Іслач» застаецца невядомым — гэтая маёмасьць фонду на дадзены момант прадаецца і знаходзіцца пад арыштам.

Нагадаем, у 2003 г. Мінʼюст накіраваў у «Беллітфонд» ліст з прапановай унесьці эмблему сваёй арганізацыі ў Дзяржаўны геральдычны рэгістр. У 2006 г. арганізацыя атрымала папярэджаньне за невыкананьне той прапановы. У тым жа годзе Мінʼюст вынес чарговае папярэджаньне фонду: на адным са сходаў пры галасаваньні па павестцы дня былі ўлічаны галасы сяброў арганізацыі, якія не змаглі трапіць на сход, але сваімі даверанасьцямі ўпаўнаважылі іншых членаў «Беллітфонду» галасаваць ад іх імя.

Саюзу пісьменьнікаў удалося сарваць спробу Мінʼюсту ліквідаваць арганізацыю, дзякуючы масавай мабілізацыі творцаў у абарону. Судзьдзя не наважыўся вынесьці зьнішчальнае рашэньне ў прысутнасьці Генадзя Бураўкіна, Уладзімера Арлова ды Вольгі Іпатавай. Праўда, Бураўкіну той працэс каштаваў інфаркту. Гэтым разам Мінʼюст дзейнічаў спрытней.

**Сямён Печанко**

# Эрык Сійгур: Што камэнтаваць,

Наша гутарка з генэральным консулам Эстоніі **Эрыкам Сійгурам** адбылася літаральна праз некалькі гадзінаў пасьля пікетаваньня будынку на другім завулку Кальцова. Спадар консул не прасіў загадзя даслаць яму пытаньні, каб азнаёміцца зь імі. А, наадварот, вельмі лёгка згадзіўся на інтэрвію. І задаваць пытаньні нечакана пачаў сам.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Эрык Сійгур:** Што Вас больш цікавіць — талінскія ці маскоўскія падзеі, бо гэта абсалютна розныя рэчы? З чаго пачнём?

**«Наша Ніва»: Давайце ўсё ж з Таліна.**

**ЭС:** Добра. Увесь сьвет лічыць, што тыя падзеі, якія адбываюцца ў Таліне — гэта ўнутраная справа Эстоніі, бо ўсё, што там здарылася, рабілася ў адпаведнасьці з эстонскім законам. Нават пасьля таго, як пачаліся марадзёрствы. Разам з тым, наша паліцыя вяла сябе вельмі карэктна і не было ніякага лішняга выкарыстаньня фізычнай сілы.

**«НН»: Дык, а з чаго ўласна пачаўся гэты канфлікт?**

**ЭС:** У 1945 годзе ў цэнтры Таліна быў усталяваны часовы драўляны помнік ахвярам фашызму, праз некаторы час ён быў узарваны дзьвюма школьніцамі. У 1947 годзе ўсталявалі ўжо гэты помнік Бронзаваму салдату. Па сёньня яшчэ не было вядома, колькі памерлых людзей знаходзіцца пад ім. Архіўных дакумэнтаў наконт гэтага практычна ніякіх няма. Хутчэй за ўсё, там знаходзіцца брацкая магіла, бо жорсткіх баёў у гэтых месцах не было. Калі сёлета праводзіліся археалягічныя раскопкі, то высьветлілася, што палова парэштакаў людзей знаходзіцца пад ходнікам. Згадзіцеся, што гэта не найлепшае для іх месца. Другі момант — гэты манумэнт выкарыстоўвалі для розных правакацыяў, там зьбіраліся вельмі гучныя акцыі, але рабіць такое на могілках мне здаецца папросту непрыгожа. Таму было прынятае рашэньне дэмантаваць помнік і перанесьці яго разам з парэшткамі людзей на вайсковыя могілкі, якія таксама знаходзяцца практычна ў цэнтры гораду. Гэтыя могілкі былі заснаваныя ў 1914 годзе, там пахаваныя парэшткі расейскіх, эстонскіх, ангельскіх жаўнераў. Гэта прыгожае і годнае месца. На сёньняшні дзень Бронзавы салдат ужо там. У канцы чэрвеня манумэнт будзе адноўлены цалкам, у такім самым выглядзе, як ён стаяў раней. Некаторыя расейскія СМІ сцьвярджаюць, што Бронзавы салдат быў расьпілаваны. Магу вас запэўніць, што гэта няпраўда.

**«НН»: Якое месца займаў Бронзавы салдат у жыцьці Таліна?**

**ЭС:** Для кожнага — рознае, бо для адных — гэта могілкі ваяроў супраць фашызму. З другога боку — гэты помнік для эстонцаў быў сымбалем савецкай улады, бо яго адмыслова паставілі ў цэнтры гораду, каб паказаць, хто тут гаспадар. Штодня, праходзячы міма гэтага помніку, тысячы эстонцаў узгадвалі пра сталінскі генацыд, пра акупацыю. У гэтым помніку было два значэньні, цяпер будзе адно.

**«НН»: А для Вас асабіста што ён значыў?**

**ЭС:** Гэта, на жаль, другі варыянт.

**«НН»: Што Вы можаце сказаць у адказ на шматлікія закіды эстонскаму боку ў фашызьме?**

**ЭС:** Афіцыйны Талін неаднаразова выступаў з заявамі, што асуджае фашызм, нацызм. У нас ня можа быць фашызму, бо ў Эстоніі свабода і дэмакратыя. Фашызм можа быць толькі пры несвабодным рэжыме. На шчасьце, не са свайго, а з чужога досьведу, але я ведаю, што такое фашызм. Ён недапушчальны. Мне здаецца, што часам мітынгоўцы павінны паглядзець у люстэрка, каб убачыць там фашызм. Мае два дзяды ваявалі па розныя бакі барыкадаў падчас вайны, але яны абодва ваявалі за незалежнасьць Эстоніі. Таму для нас няма розьніцы паміж вэтэранамі, бо ўсе яны ваявалі за нашу краіну. Шмат у каго папросту не было выбару, бо іх прымусова мабілізавалі

**«НН»: Большасьць цяпер пагаджаецца, што талінскіх пратэстаў можна было чакаць?**

**ЭС:** Канечне, мы чакалі нейкіх выступаў, але абсалютна не чакалі такога марадэрства. Мітынгаваць і выказваць свае погляды мае права кожны. Але тое, што адбылося ў Таліне, — гэта чыстае марадзёрства. Ёсьць інфармацыя, што прадстаўнікі расейскага пасольства яшчэ за некалькі тыдняў да выступленьняў сустракаліся з арганізатарамі гэтых беспарадкаў. Паліцыя, на шчасьце, змагла справіцца з хвалямі мітынгоўцаў і пратэсты не захапілі ўвесь горад. Можна было бачыць, што тых, хто выйшаў на вуліцы Таліна, было вельмі нямнога, таму нават гаварыць, што ўсё расейскае насельніцтва Эстоніі выказалася супраць дэмантажу Бронзавага жаўнеру, не выпадае. Эстонскае насельніцтва ўспрыняло гэтыя пагромы досыць спакойна, хаця і сярод эстонцаў ёсьць праціўнікі пераносу помніку. Зрэшты, сярод апошніх папросту шмат тых, хто баяўся нэгатыўнай рэакцыі Расеі. Цяпер у Таліне ўсё спакойна. Пра нядаўнія пагромы нагадваюць толькі большая колькасьць паліцэйскіх у цэнтры, а таксама пабітыя шыбы ў крамах.

**«НН»: Прадухіліць пратэсты было магчыма?**

**ЭС:** Не магу вам дакладна адказаць на гэтае пытаньне. Нават калі лічыць усе гэтыя падзеі арганізаванымі, то, у нейкай ступені, мы, пэўна, прадбачылі, што такія падзеі магчымыя.

**«НН»: Цяпер, напэўна, пагаворым пра рэакцыю Расеі.**

**ЭС:** Што да Расеі, то мне здаецца, яна зьняла сваю маску. Расейскі бок выкарыстоўвае няправільную інфарма-

# калі бачыш партрэт Сталіна

цыю. Гэта сапраўдная атака на незалежную краіну і, здаецца, гэтая атака іх цікавіць нашмат болей, чым сам помнік. Мне здаецца, што расейцаў павінен больш цікавіць выпадак у Хімках, калі пасьля раскопак увогуле былі згубленыя парэшткі ахвяраў вайны. Я наагул не ўяўляю, як гэта магчыма. Яны могуць пагражаць нам эканамічнымі санкцыямі, гэта іх права, але гэта ня лёсавызначальна для Эстоніі. Мы не плянуем ніякіх эканамічных ці палітычных мер, бо гатовыя да дыялёгу з Расеяй. Мы былі суседзямі, імі і застаёмся.

**«НН»: Дык Вы лічыце, што Расея працягвае не прызнаваць эстонскую незалежнасьць?**

**ЭС:** Што тут камэнтаваць. Па-мойму, адказ ужо ёсьць у вашым пытаньні. Калі чуеш, што гавораць расейскія палітыкі і палітолягі, то ў гэтым няма абсалютна ніякіх сумневаў. Яны перажываюць, што няма ранейшай імпэрыі. Справа нават не ў Эстоніі.

**«НН»: А чаму да апошняга маўчала Эўропа?**

**ЭС:** У чацьвер «эўратройка» зрабіла вельмі рэзкую і адназначную заяву, дзе падтрымала эстонскі бок. Падобную ж заяву зрабіў і Дзярждэпартамэнт ЗША. Першыя дні яны маўчалі, бо чакалі пачатку дыялёгу між Расеяй і Эстоніяй. Гэта была ініцыятыва Ангелы Мэркель, яна тэлефанавала і нашаму прэм’еру, і Пуціну.

**«НН»: Здаецца, талінскія падзеі агалілі праблему нежаданьня расейцаў інтэгравацца ў эстонскае грамадзтва?**

**ЭС:** Сёньня абсалютна відавочна, што гэтыя працэсы праходзяць не дастаткова хутка. Гэтай праблемай ужо пачалі актыўна займацца. Наш прэм’ер вельмі добра сказаў, што ва ўсіх нас было рознае мінулае, але ў нас ёсьць адзіная будучыня. Нават калі ў грамадзтве ёсьць розныя меркаваньні, гэта ня значыць, што Эстонія падзеліцца. Шмат хто атрымаў грамадзянства Эстоніі, яны бачаць сваю будучыню толькі ў гэтай краіне, тым больш што тых, хто выйшаў на вуліцы, было вельмі мала.

**«НН»: Вы чакалі, што пачнуцца пікетаваньні консульства ў Менску?**

**ЭС:** У людзей павінна быць свабода выказваньня сваіх поглядаў, але мы не маглі працаваць праз гэтыя пікетаваньні, бо маскоўскі досьвед досыць сумны. Мы абавязкова будзем зьвяртацца да беларускіх уладаў з пытаньнем, чаму яны не паінфармавалі нас, што будуць ладзіцца пікеты. Калі пікеты несанкцыянаваныя, то я ня ведаю, чаму іх дапусьцілі. Было недзе сто чалавек. Скандавалі, што не дапускаюць фашызму. Пікеты былі досыць каларытнымі, бо людзі выйшлі з партрэтамі Сталіна і Леніна. Мне тэлефанавалі зь некаторых радыёстанцый, прасілі пракамэнтаваць гэта. Але што камэнтаваць, калі ты бачыш партрэт Сталіна побач зь беларускім сьцягам. Гэта значыць, што сталінізм, на жаль, не памёр. Паводле папярэдняй інфармацыі, гэта быў мітынг таварыства вэтэранаў, але вэтэранаў было чалавек пяць-шэсьць. Астатнія — моладзь. Мне падалося, што гэтым хлопцам і дзяўчатам проста сказалі ў школах і ўнівэрсытэтах: «Вы пойдзеце на акцыю», — яны і пайшлі. Хаця, магчыма, я і ня маю рацыі. Калі сыходзіла адна група, то адразу падыходзіла іншая. Усё было вельмі добра арганізавана.

**«НН»: Як Вам рэакцыя беларускіх уладаў?**

**ЭС:** Апроч заяваў прэс-сакратара МЗС Андрэя Папова, практычна больш ніякай рэакцыі не была. Яшчэ была заява Сяргея Гайдукеіча, што Бронзавага салдата варта перанесьці на мяжу паміж Беларусьсю, Украінай і Расеяй. Скажу адназначна: не аддамо. У цэлым жа рэакцыя беларускіх уладаў была цалкам спакойнай і стрыманай. У гэтым пляне я не магу выказаць ніякіх прэтэнзіяў.

**«НН»: Пратэстоўцы абяцаюць на 9 траўня вельмі вялікія акцыі пратэсту.**

**ЭС:** Ніякага бунту ў Таліне на 9 траўня ня будзе, дайце веры.

Эрыку Сійгуру засталося прабыць у Беларусі тры месяцы. Ужо пры выключаным дыктафоне пытаецца: здагадайцеся, дзе будзе мая наступная місія? Паціскаю плячыма. Кажа, што ў Маскве. Сьмяецца: «Можа быць, пасьля гэтага інтэрвію мне і не дадуць візы».

**Гутарыў Зьміцер Панкавец**



DRIVE-ALIENN.LIVEJOURNAL.COM

**Расейскамоўная моладзь адказала на перанос Салдата пагромамі.**

# Пераключаючы каналы


PHOTO.BYMEDIA.NET

Эліта разумее: кварталы, у якіх яна жыве, выразна розьняцца ад «непрэстыжных». У прыватнасьці, колькасьцю «талерак» на дахах. Піша **Віталь Тарас**.

Пасьля таго як запуск першага беларускага спадарожніка БелКа скончыўся няўдачай (ракета-носьбіт узарвалася на старце з касмадрому ў Байкануры), нарадзілася нямала жартаў на гэты конт. Адзін зь іх быў такі: ДАІ Беларусі распрацавала новы папяраджальны дарожны знак «Асьцярожна, нізкалятучыя спадарожнікі!».

## Талеркай па галаве

Нядаўняе зьяўленьне інфармацыі аб запуску ўвосень польскага тэлевізійнага праекту «TV Belarus», напэўна, выклікала ў кіраўніцтва Беларусі непрыемныя асацыяцыі на касьмічныя тэмы. Толькі, зразумела, яму вельмі хацелася б, каб гэты праект таксама пацярпеў няўдачу на самым старце. Як вядома, Аляксандар Лукашэнка назваў гэты праект «дурацкім». Іншай рэакцыі цяжка было чакаць. Але сам факт, што кіраўнік дзяржавы рэагуе на інфармацыю аб будучым тэлевяшчаньні на Беларусь, гаворыць аб тым, што гэтая інфармацыя ўспрымаецца на самым версе ўлады вельмі сур’ёзна.

Яшчэ больш гаворыць за сябе намер уладаў забараніць тэлеталеркі для прыёму спадарожнікавага тэлебачаньня. Пра першыя такія спробы ў Лідзе «Наша Ніва» падрабязна пісала. Барацьба вядзецца пад выглядам датрыманьня тэхнікі бясьпекі й клопату пра здароўе грамадзянаў. Маўляў — няправільна ўсталяваная антэна на сьцяне альбо даху шматпавярховага будынку можа зваліцца на галаву выпадковаму мінаку. І хто тады будзе адказваць — ЖЭС? Дарэчы, у інструкцыі, якая была прынятая ўладамі яшчэ ў 1994-м і цяпер выцягнутая на сьвет, згадваецца яшчэ адна, куды больш цікавая падстава, паводле якой жыхарам шматкватэрнага дому можа быць адмоўлена ва ўсталяваньні талерак. А менавіта — калі ваш дом далучаны да сеткі кабэльнага тэлебачаньня альбо на ім усталяваная адпаведная антэна для яго прыёму, ставіць індывідуальную талерку вы ня маеце права. То бок мясцовая ўлада за вас вырашае, якія пакеты тэлеканалаў якіх кампаніяў вам глядзець, а якія — не.

Ня трэба думаць, што ў 1994-м чыноўнікі ў Беларусі былі ўжо настолькі ідэалягічна пільнымі й глядзелі гэтак далёка наперад, у год 2007-ы. Зьяўленьне такой пастановы альбо інструкцыі было прадыктавана, хутчэй, чыста мэркантыльнымі інтарэсамі. Усе кабэльныя сеткі, калектыўныя антэны і г.д. прыносяць прыбытак ня толькі фірмам, якія гэтым займаюцца, але й дзяржаве. Канкрэтна — мясцовым чыноўнікам. Чым больш забаронаў і інструкцыяў, тым больш падставаў для хабарніцтва.

Чалавек жа, усталяваўшы ў сябе спадарожнікавую антэну й цюнэр, якія робяцца з кожным годам усё больш даступнымі паводле цаны, і заплаціўшы за ўсталяваньне, можа пляваць згары на ўсіх чыноўнікаў зь іх ліцэнзіямі ды абмежаваньнямі. І гэта прыводзіць іх у шал.

Нікому, улучна з найвышэйшым начальствам, па вялікім рахунку няма справы да таго, што канкрэтна будзе паказваць «TV Belarus». Ніхто яго яшчэ ня бачыў. І ці будуць перадачы незалежнага беларускага тэлеканалу з-за мяжы настолькі цікавымі, што глядач аддасьць яму перавагу сярод тысячаў іншых каналаў, якія можна глядзець праз спадарожнікі Хотбёрд і Сырыюс, невядома. Нават калі выключыць з тых тысячаў каналы на арабскай, кітайскай, бэнгальскай ды іншых экзатычных мовах, выбар застаецца надзвычай багатым. Спаборнічаць з тым самым RTVI, з польскімі ды ўкраінскімі тэлеканаламі, ды нават з «АджараТВ» зь яго заходнімі фільмамі (як правіла — высакаякаснымі), ды яшчэ з расейскамоўнай агучкай, вельмі няпроста.

## Свабода запінгу

Але ідэалягічнае начальства ня можа не разумець (ці на ўзроўні інстынкту не адчуваць) небясьпеку, якая навісла

над лукашэнкавай Беларусьсю ў простым і пераносным сэнсе слова.

Спадарожнікавае тэлебачаньне (ня толькі «TV Belarus») дае грамадзянам альтэрнатыву, свабоду выбару. Кожны ўладальнік спадарожнікавай антэны ў спалучэньні з кампутарам можа ня проста выбіраць каналы, але стварыць уласную тэлепраграму. Чалавека, які падсеў на «спадарожнік», ужо не прымусіш глядзець БТ і іншых з навязьлівай і бязьмежна тупой тэлерэклямай. Перад гледачом, незалежна ад ягонай суб'ектыўнай волі, адчыняецца сьвет ва ўсёй яго разнастайнасьці. Канечне, можна казаць, што гэта ілюзія, што мэдыі ствараюць скажоны адбітак рэальнасьці. Але тэлебачаньне даўно зрабілася яе неад'емнай часткай. Яно дыктуе свае законы ўспрыняцьця рэчаіснасьці.

Яно спарадзіла, напрыклад, такую зьяву, як «запінг» (калі глядач дзеля забавы адвольна скача з аднаго каналу на другі, пераключаючы карцінку з дапамогай дыстанцыйнага пульту). Стыль «запінгу» можна назіраць у большасьці сучасных кліпаў, фільмаў. Адна амэрыканская камедыя 1988-га так і называлася: «Пераключаючы каналы».

Дый сама рэчаіснасьць у наш час усё больш нагадвае «запінг», дзе спалучаюцца няспалучальныя рэчы. Хакей і вайна з тэрарызмам. Сарказі і Руаяль. Калдун і Філарэт. Пагромы і ўскладаньне кветак да Бронзавага жаўнера.

Нехта з амэрыканскіх сацыёлягаў заўважыў, што тэлебачаньне, несумненна, цікавейшае за чалавека. Інакш людзі, а не тэлевізары, стаялі б на ганаровым месцы ў куце кожнай кватэры.

Калі сур'ёзна, сёньня яшчэ тэлебачаньне, а не інтэрнэт (хоць зь цягам часу яны зьліюцца), дамінуе ў сродках масавай камунікацыі. І таталітарная ўлада будзе імкнуцца захаваць татальны кантроль над тэлеканаламі. Хоць гэтыя спробы робяцца ўсё больш прывіднымі з разьвіцьцём сучасных камунікацыйных тэхналёгіяў.

Тое, што большасьць уладальнікаў спадарожнікавых талерак, як і большасьць тэлегледачоў ва ўсім сьвеце, аддае перавагу перадачам забаўляльным і спартовым, справы не мяняе. Гэта толькі ўскладняе сытуацыю для ўлады. Бо, здымаючы талеркі з мэтай не дапусьціць прагляду апазыцыйнага каналу, яна мусіць адабраць у насельніцтва саму магчымасьць глядзець спадарожнікавае тэлебачаньне.

Ці гатовыя ўладальнікі талерак — найбольш перадавая, актыўная і заможная частка аўдыторыі — адмовіцца ад іх? Для многіх талерка зрабілася такой самай неад'емнай часткай жыцьця, як аўтамабіль, мабільны тэлефон, загарадны дом.

## Тэлебачаньне не для ўсіх

У дзяржаве, дзе магчымая татальная канфіскацыя талерак, магчымая і канфіскацыя аўтамабіляў, тэлефонаў, прыватных дамоў разам зь зямлёй.

І хоць поўная канфіскацыя спадарожнікавых антэнаў не ўдалася нават у Іране, выключаць такое ў постсавецкай дзяржаве, улады якой імкнуцца захаваць савецкія традыцыі, нельга.

Размова не пра інтэнцыі ўлады, у якой няма ніякіх маральных ці нават рацыянальных абмежаваньняў. Размова пра грамадзтва, у якім за апошнія дзесяцігодзьдзі ня толькі не сфармаваліся, але амаль што згасьлі грамадзянскія інстынкты — здольнасьць і жаданьне адстойваць свае элемэнтарныя правы. У тым ліку права на інфармацыю. І права карыстацца роднай мовай.

Выхад у этэр «TV Belarus» можа стаць лакмусавай паперкай, праверкай грамадзтва — і адначасова ўлады — на здольнасьць успрымаць нешта новае і разьвівацца ў прынцыпе.

Хутчэй за ўсё, спадарожнікавыя антэны ня зьнікнуць. Але іх можа стаць значна меней. Не абавязкова здымаць усе талеркі запар. Дастаткова пакараць высокімі штрафамі некалькі чалавек, і астатнія паасьцерагуцца ставіць антэны без дазволу.

Дазвол будзе выдавацца толькі выбраным — чыноўнікам высокага рангу, набліжаным да ўлады прадпрымальнікам, артыстычнай, музычнай, літаратурнай, навуковай і іншай афіцыйнай эліце.

Нешта падобнае ў гісторыі ўжо было. Прычым зусім нядаўна. Сыстэма закрытых разьмеркавальнікаў, створаная за камуністычным часам, ахоплівала на пачатку 80-х увесь СССР. Закрытыя (дакладней — адкрытыя для нямногіх) крамы і сталовыя, закрытыя атэлье, закрытыя лазьні і саўны, закрытыя курорты... А былі яшчэ закрытыя кінапрагляды. І гэта прыносіла тагачаснай савецкай эліце найвышэйшы кайф. Яшчэ большы, чым магчымасьць жэрці бутэрброды з чорнай ікрой ці дэфіцытнай на той час сухой каўбасой па зьніжанай для эліты цане. (Падачкі для вэтэранаў у выглядзе харчовых пайкоў да Дня Перамогі агульнай карціны не мянялі).

Усе заходнія фільмы, забароненыя да паказу ў шырокім пракаце (напрыклад, у што цяжка паверыць, «Палёт над зязюльчыным гняздом» Мілаша Формана), партыйнае начальства і дзеячы культуры з партбілетамі маглі бачыць на закрытых сэансах. У тым ліку, на кінастудыі «Беларусьфільм», куды, як на любое рэжымнае прадпрыемства, можна было трапіць толькі з пропускам.

Важным было не эстэтычнае задавальненьне, атрымаць якое большасьць «дапушчаных» было проста няздольнае з-за адсутнасьці густу ці інтэлекту, а тое, што яны былі далучаныя да «таямніцы», якая і складае моц бюракратычнай дзяржавы.

У пераважнай масы савецкіх людзей закрытыя разьмеркавальнікі выклікалі нянавісьць яшчэ большую, чым недахоп прадуктаў і рост цэнаў на іх. Чым гэта скончылася для камуністычнай эліты, добра вядома.

Але цяперашнія ўлады, як тыя Бурбоны, усё памятаюць і нічому не навучыліся.

Афіцыйная забарона ўжываць у рэкляме тэрміны «элітнае жыльлё» і «прэстыжны раён» гаворыць аб тым, што сама эліта выдатна разумее: кварталы, у якіх яна жыве, выразна адрозьніваюцца ад «непрэстыжных». У прыватнасьці, элітныя дамы рэзка вылучаюцца колькасьцю талерак на іх.

БТ ж, у адрозьненьне ад сатэлітнага TV, становіцца тэлебачаньнем для бедных, сурагатам.

Як доўга беларускі глядач будзе задавальняцца сухім пайком? Пытаньне адкрытае. Адказ у немалой ступені залежыць і ад таго, што зможа прапанаваць «TV Belarus».

Але гэта ўжо тэма зусім іншай размовы.



**Павал Севярынец** — у 1998—2004 лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту». Асуджаны за арганізацыю акцыяў пратэсту пасьля рэфэрэндуму 2004 году. Цяпер у высылцы ў Малым Сітне, на поўначы Полаччыны.

ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ

# Бацькі, дзеці і судзьдзі

«Усе мы ведаем, што сыстэма дрэнная, — усьміхаецца майстар, — але ж паспрабуй сказаць што-небудзь, калі кантракт на год, у цябе дзіцё, а іншай працы няма». «Мы таксама супраць, але калі начальства прыяжджае — маўчым, — падтаквае жонка чыгуначніка. — А я што, у мяне сын у Менск паступае». «У іх улада, міліцыя, войска, суды», — завяршае сусед-«хімік», — вось і паспрабуй рыпніся».

«Каб хто-небудзь абараніў нас ды нашых дзяцей, — гучыць у падктэсьце, — пайшлі б за вамі».

Днямі мая маці атрымала пастанову аб звальненьні. Настаўніца найвышэйшае катэгорыі з 36-гадовым стажам, працавала і ў вёсках роднага Лунінецкага раёну, і ў Пагосьце ды Барані пад Воршай, і ў Віцебску; два гады да пэнсіі — і вось, загад райана. Зуб на яе тачылі даўно: увесь час прынцыпова выступала на сходах, абараняла маладафронтаўцаў, якіх хацелі выдаліць са школы, займалася стварэньнем Беларускай Хрысьціянскай Дэмакратыі ў Віцебску, удзельнічала ў выбарах ды назіраньні (дарэчы, у 2004 г. з усёй ініцыятыўнай групы сабрала за мяне найбольш подпісаў — 600)… То бел-чырвона-белы сьцяг, скінуты з асьвятляльнае вежы амфітэатру міліцыянтамі, падбярэ, то нейкія падазроныя беларускія спэктаклі паводле Караткевіча зь дзецьмі ладзіць, то шоў беларушчыны замест кляснае гадзіны. На вясновых школьных вакацыях атрымала пісьмовы (!) дазвол на тыднёвую паездку ў Варшаву, дзе, апроч іншага, пахаваны мой прадзед, праваслаўны сьвятар; падрыхтавала дакумэнты, зрабіла замежны пашпарт… У апошні момант з райана патэлефанавалі і папярэдзілі: на Дзень Волі ніякіх паездак. Маці паехала.

Школьны прафкам, сабраны на тэлефанаваньне «згары», бурчэў: от, кіраўніцтва нашымі рукамі хоча такую настаўніцу выгнаць!.. Пабурчэлі, апусьцілі вочы — і прагаласавалі за звальненьне.

Здавалася б, чарговае пацьверджаньне ўсёмагутнасьці рэжыму.

Але назаўтра пасьля звальненьня з 27 бацькоў школьнікаў, што навучаюцца ў матчыным 5 «А», 24 падпісалі зварот у яе абарону. Самі школьнікі склалі ліст дырэктару. Віцебскія калегі-дэмакраты і праваабаронцы распачалі кампанію салідарнасьці. Дыпляматы даслалі запыт у Міністэрства адукацыі. Даведаўшыся праз інтэрнэт, ліст у падтрымку маці напісаў нават адзін зь яе колішніх вучняў, што зьехаў у Ізраіль. Знаёмыя вернікі пачалі мэтадычна абтэлефаноўваць школьнае начальства. І вось ужо ўся настаўніцкая чытае выразкі зь незалежнае прэсы ды раздрукоўкі зь сеціва й перашэптваецца: ага, найшла каса на камень!

У 16-гадовай школьніцы Насты Палажанкі, абвінавачанай у справе «Маладога фронту», звальняюць з працы бацьку, які адзін гадуе дзьвюх дачок. Крысьціну Шацікаву ды

## ХРОНІКА АПАЗЫЦЫІ

### 3 траўня

**Штраф Хведаруку**

Судзьдзя Людміла Савасьцян дала Зьмітру Хведаруку 30 мінімальных базавых адзінак (930.000 рублёў) штрафу за ўдзел у «Чарнобыльскім шляху». Днём раней Зьмітра выклікалі на допыт у КДБ, дзе цікавіліся дзейнасьцю салігорскіх, жодзінскіх, нясьвіскіх маладафронтаўцаў.

**Флэш-моб за вольную прэсу**

А 18-й на пляцы Якуба Коласа ў Менску дэмакратычная моладзь правяла флэш-моб.



WWW.SVABODA.ORG

Маладзёны разгарнулі газэты «Народная воля», «Наша Ніва», «Товарищ» і дэманстратыўна іх чыталі. Міліцэйскі апэратар усіх зьняў на камэру.

**У Казуліна новы адвакат**

3 траўня палітвязьня **Аляксандра Казуліна** наведаў у калёніі новы адвакат **Зьміцер Гарачка**. Паводле зьвестак, якімі ён падзяліўся з дачкой палітыка Юліяй, А.Казулін па-ранейшаму мае праблемы са здароўем. Тым часам пракуратура Менску адмовілася разглядаць скаргі на зьбіцьцё А.Казуліна 2 сакавіка 2006 г. у фае Палацу чыгуначнікаў, дзе праходзіла рэгістрацыя дэлегатаў Усебеларускага сходу.

### 4 траўня

**Мін'юст ліквадаваў Беллітфонд**

Ліквідацыя адбылася з ініцыятывы Міністэрства юстыцыі. Суд не задаволіў просьбу кіраўніцтва арганізацыі аб пераносе справы. Судзьдзя **Валеры Самалюк** паведаміў, што рашэньне суду не падлягае касацыйнаму абскарджаньню. Мін'юст закідаў кіраўніцтву Беллітфонду шматлікія парушэньні, якія не былі выпраўленыя.

**Ляўковіч пакараны штрафам**

Судзьдзя Савецкага раёну **Людміла Савасьцян** пакарала **Анатоля Ляўковіча** штрафам у 20 базавых велічыняў (620 000 рублёў). В.а. старшыні партыі А.Ляўковіча затрымалі а 12.40, у пятніцу, на праспэкце Ракасоўскага ля офісу партыі БСДП. Яго зьвінавацілі ў арганізацыі несанкцыянаванага шэсьця 1 Траўня.

**БРСМ бушуе**

Другі дзень ля консульства Эстоніі дзяжурылі прадстаўнікі БРСМ і вэтэраны, якія пратэставалі супраць пераноса помніка савецкім салдатам. У руках мітынгоўцы трымалі савецкія сьцягі і лёзунгі, а таксама партрэты савецкіх правадыроў.

**Дзяжурства ў Горадні**

У Горадні ад 4 траўня распачата штодзённае дзяжурства моладзі каля будынкаў старой часткі гораду, вызначаных уладамі пад знос.

### 6 траўня

**Акцыя ў абарону касьцёлу Сьвятога Язэпа**

Актывісты «Ініцыятывы» правялі акцыю суп-

Ўладзімера Шылу пагражаюць пазбавіць бацькоўскіх правоў…

Дзякуй Богу, мы з бацькамі адзін аднаго падтрымліваем. Але ведаю, што многім маладафронтаўцам даводзіцца змагацца і з матчыным адчаем, і з бацькавай злосьцю. I калі на вуліцы Менску выходзяць тысячы юнакоў і дзяўчат, не дае спакою пытаньне: а дзе ж іхныя бацькі? Гэта ж так проста: быць побач са сваімі дзецьмі!

Наймацнейшая салідарнасьць — гэта калі бацькі за дзяцей, а дзеці за бацькоў. У час, калі Лукашэнка рыхтуе дзеля ўмацаваньня ўлады сваіх сыноў, а раённая намэнклятура кварталамі скупае для нашчадкаў нерухомасьць у Менску, супрацьстаяць рэжыму здолеюць толькі дружныя беларускія сем'і. Пазьнякі й Вячоркі, Сіўчыкі й Хадыкі, Мілінкевічы ды Казуліны, Вольскія ды Арловы, Навумчыкі ды Шылы.

Рэжым гэта ведае, таму і б'е: дзяцей па бацьках, бацькоў па дзецях.

Прычым робіцца гэта ў афіцыйна абвешчаны Год Дзіцяці.

А вось судзьдзя Таманаў, якому даручылі весьці працэс «Маладога фронту», адмовіўся судзіць дзяцей за тое, што яны хочуць свабоды, праўды й справядлівасьці: падаў заяву на доўгатэрміновы адпачынак у сувязі са станам здароўя. Не запэцканага ў палітычных рэпрэсіях Таманава хацелі *ўключыць у рэжым* — але судзьдзя, відаць, чытаў у школе «Маладую гвардыю». Як для судзьдзі ў сёньняшняй сытуацыі — сумленны выбар. Цікава: а што — у нас іншыя судзьдзі абсалютна здаровыя? А чыноўнікі? А генэралы?..

Бацькі віцебскіх школьнікаў і судзьдзя Таманаў — не апазыцыянэры. Яны проста беларусы. I калі супрацiўляцца рэжыму пачынае не адно апазыцыя, а паспаліты беларускі люд — рэжым асуджаны на паразу.

Падтрымаць сваё дзіця, бацьку ці маці; падпісаць зварот; не падняць руку, калі галасуюць за «палітычнае» звальненьне; прыйсьці на суд да маладафронтаўцаў або своечасова сысьці ў адпачынак па стане здароўя — гэта супраціў, на які здольны кожны. I паверце: у мільёнаў беларусаў ёсьць усе прычыны да такога супраціву далучыцца. Задача дэмакратаў — арганізаваць. Растлумачыць. Даць прыклад.

Калі за дзецьмі падымаюцца бацькі, калі супраць хлусьні й несправядлівасьці паўстаюць і старыя, і малыя; калі судзьдзі адмаўляюцца за гэта судзіць — значыць, ужо блізка нацыянальнае абуджэньне.

*Малое Сітна*

> Наймацнейшая салідарнасьць — гэта калі бацькі за дзяцей, а дзеці за бацькоў.

## Севярынца завярнулі з дарогі

9 траўня Павал Севярынец меўся адказваць на пытаньні чытачоў сайту nn.by у рэжыме рэальнага часу. Аднак 8 траўня Паўла, які ехаў у адпачынак дахаты, спынілі на паўдарозе.

Атрымаўшы законны трохдзённы адпачынак, Павал ад ранку прайшоў пехатою шэсьць кілямэтраў да станцыі Алёшча, сеў у цягнік, даехаў да Полацку — і ў гэты момант яму патэлефанавалі на мабільнік са спэцкамэндатуры. Палітыку загадалі тэрмінова вяртацца ў Малое Сітна, дзе ён адбывае пакараньне. Што сталася нагодай для такога загаду, невядома.

Маці Паўла, Тацяна Севярынец, кажа, што, найхутчэй, Паўла адпусьцяць у адпачынак пазьней, пры канцы тыдня, ці на наступным тыдні. Але можна працягваць пісаць пытаньні палітыку на сайце «Нашай Нівы».

# ХРОНІКА АПАЗЫЦЫІ

рацьперабудовы касьцёлу Сьвятога Язэпа ў гатэль. Удзельнікі раздавалі ўлёткі каля палацу спорту і ля прыпынку «Няміга». Таксама былі прадэманстраваны мінакам праекты «рэканструкцыі» будынкаў МУС, Менгарвыканкаму і Белсаўпрофу, якія арганізатары акцыі прапануюць зьдзейсьніць замест зьдзеку са старажытнага касьцёлу. У акцыі ўзяло ўдзел каля 20 актывістаў.

### 7 траўня

### Акцыя памяці Юр'я Захаранкі

На Кастрычніцкай плошчы ў Менску адбылася акцыя з нагоды 8-й гадавіны з дня зьнікненьня былога міністра ўнутраных справаў **Юр'я Захаранкі**. 14 маладых людзей стаялі з партрэтамі Захаранкі й палітзьняволеных. Акцыя працягвалася каля 10 хвілін. Пасьля ўдзельнікі накіраваліся да сквэру Янкі Купалы. Там да маладых людзей пад'ехалі дзьве машыны міліцыі. Зь іх выйшлі спэцназаўцы й забралі ва ўдзельнікаў акцыі партрэты. Ніхто ня быў затрыманы.

### Пікет у абарону Клімава

У Менгарвыканкам пададзеныя заяўкі на правядзеньне 21—22 траўня пікетаў у абарону апазыцыйнага палітыка **Андрэя Клімава**. Іх зьбіраюцца праводзіць сябры Аб'яднанай грамадзянскай партыі. Клімаў быў арыштаваны ў Менску 3 красавіка. Падставай для арышту палітыка сталі яго артыкулы, апублікаваныя на сайце АГП. А. Клімаву пагражае да 5 гадоў турмы.

### Адкрыты суд над маладафронтаўцамі

Актывістаў незарэгістраванай арганізацыі «Малады фронт» Насту Палажанку, Аляксея Янушэўскага, Зьмітра Хведарука, Алега Корбана і Барыса Гарэцкага пачнуць судзіць 30 траўня. Суд пачнецца а 14.15 у судзе Савецкага раёну Менску. Справу маладафронтаўцаў будзе разглядаць судзьдзя **Руслан Аніскевіч**. У адрозьненьне ад папярэдніх судоў паводле 193-га артыкулу (Зьміцер Дашкевіч, актывісты «Партнэрства») гэты будзе адкрытым.

### Акцыя «Бунту» ў БНТУ

7 траўня актывісты незарэгістраванай арганізацыі «Бунт» правялі гумарыстычную акцыю «Stop БРСМ». На дзьвярах галоўнага офісу БРСМ Нацыянальнага тэхнічнага ўнівэрсытэту яны прымацавалі лялькі з надпісамі «Гонар», «Сумленьне», «Свабода». Вакол шыі кожнай лялькі быў завязаны БРСМаўскі гальштук. Актывісты расклейвалі ва ўнівэрсытэце налепкі «Сдай друга и получи зачёт автоматом», «Живи веселей, стучи на друзей».

Падчас акцыі здарыўся невялікі канфлікт між актывістамі і функцыянэрамі БРСМ.

### 8 траўня

### Новы сьледчы ў справе Дзянісава

У справе моладзевага актывіста **Дзяніса Дзянісава** прызначаны новы сьледчы **Аксана Муравіцкая**. Аднак дагэтуль яна не атрымала матэрыялаў сьледзтва. Дз.Дзянісаў быў адпушчаны 11 красавіка пад заклад са сьледчага ізалятару ў Віцебску. Нагадаем, Дзянісаву прад'яўлена абвінавачаньне паводле арт. 342 КК (арганізацыя дзеяньняў, якія парушаюць грамадзкі парадак і супрацьдзейнічаюць уладзе). Яго затрымалі 18 чэрвеня 2006 г. у Віцебску. Тады група моладзевых актывістаў зь незарэгістраванай арганізацыі **«Бунт»** вывесіла бел-чырвона-белы сьцяг і распаўсюдзіла ўлёткі.

# Рэфэрэндум і бульдозэры

У Горадні зьбіраюць подпісы за рэфэрэндум у абарону старога гораду.

У траўні ў Горадні пачнуць пашыраць Стары мост церазь Нёман. Гэта мае павялічыць транспартны паток у гістарычным цэнтры гораду. Таксама ў плянах стварэньне шматпалоснай дарогі паўзьверх участку гістарычнага ляндшафту. Акрамя таго, выязная рада Міністэрства культуры адобрыла знос кварталу Новы сьвет. Разбурэньне камяніцаў там ужо ідзе. Побач з старой сынагогай зеўраюць траншэі. Тэрыторыя ж належыць да ахоўнай зоны першай катэгорыі.



АЛЕСЬ ЗАЛЕЎСКІ

Гарадзенская моладзь спыніла бульдозэр.

Гарадзенскія перабудовы выклікаюць пратэсты грамадзкасьці. На будынках, падрыхтаваных пад знос, ды на парэнчах Старога мосту актывісты вывешваюць расьцяжкі «Выратуем Горадню» і «Стоп, вандалы». Ад 4 траўня ля «аварыйных» аб'ектаў ладзяцца дзяжурствы.



АЛЕСЬ ЗАЛЕЎСКІ

Мэр Антоненка — вялікі прыхільнік рэканструкцыі Горадні.

Дайшло й да адкрытага супрацьстаяньня падчас спробы «ўмацаваць» бульдозэрам бераг ракі Гараднічанкі побач з сынагогай. Пабачыўшы там бульдозэр, гарадзенскія гісторыкі выклікалі міліцыю. Разам зь ёю зьявіліся старшыня гарвыканкаму Аляксандар Антоненка і супрацоўнік абласнога КДБ.

Міліцыянты адмовіліся складаць пратакол па факце парушэньня заканадаўства аб ахове гістарычнай спадчыны, спаслаўшыся на тое, што закону ня знаюць. Прысутным патлумачылі, што «рамонт» тут ідзе на загад А.Антоненкі. Бульдозэр крануўся зь месца. Моладзь кінулася напярэймы. Пачаліся затрыманьні. Археоляга Юлію Юркавец міліцыянты груба штурхнулі. Юлія на апошніх месяцах цяжарнасьці. Гісторыку Вользе Чайчыц выкруцілі руку.

Абаронцы Горадні пастанавілі арганізаваць гарадзкі рэфэрэндум па праблемах захаваньня гістарычнага цэнтру і разьвіцьця транспартнай сыстэмы. Сярод ініцыятараў — гісторыкі Андрэй Вашкевіч, Алесь Смалянчук і Аляксандар Краўцэвіч, каваль-рэстаўратар Юрась Мацко, заснавальнік Саюзу палякаў Беларусі Тадэвуш Гавін, старшыня таварыства літоўскай меншасьці «Цівіне» Альгіс Дзіргінчус, дэпутат гарсавету Сяргей Кузьмянок.

Каб рэфэрэндум адбыўся, ініцыятыўнай групе трэба сабраць 20 тыс. подпісаў (10% ад колькасьці выбарцаў Горадні). У ініцыятыўную групу запрашаюць знаных і паважаных у горадзе асобаў. Сярод першых далучыўся актор і бард Віктар Шалкевіч.

У адказ пачаліся запалохваньні. Ініцыятара акцыі, журналіста Алеся Залеўскага выклікаў на гутарку супрацоўнік міліцыі Сяргей Вечар.

Гэты міліцыянт вядомы тым, што арганізуе прэвэнтыўныя затрыманьні актывістаў, выступае сьведкам на палітычна матываваных працэсах.

Паводле словаў дачкі гісторыка Алеся Смаленчука Вольгі, вучаніцы 11 клясы, дырэктар школы загадаў іншым вучням абмежаваць зь ёю кантакты. «Мне расказалі вучні паралельных клясаў, што клясныя кіраўнікі загадалі ім не размаўляць са мною і нічога ад мяне ня браць», — кажа Вольга. На яе думку, такім чынам спрабуюць абмежаваць распаўсюд сярод школьнікаў інфармацыі пра падзеі ў горадзе.

**Сямён Печанко**

# Цэнтральнаэўрапеец прэзыдэнтам Францыі

Мілінкевічу будзе лёгка знайсьці супольную мову зь **Нікаля Сарказі**.

Зразумела, хто б ні перамог у барацьбе за пасаду кіраўніка Францыі, перакладчык Мілінкевічу не патрэбны, бо ён добра ведае мову гэтай краіны. Але ў сэнсе пераносным — беларускую дэмакратычную грамаду хутчэй зразумее менавіта Сарказі.

Рэч нават ня ў тым, што Сарказі дасылаў Мілінкевічу ліст са словамі падтрымкі перад Днём Волі, а раней яны не аднойчы сустракаліся асабіста. Важнейшымі падаюцца іншыя чыньнікі.

Сарказі выглядае рашучым лідэрам, ня схільным да залішніх рэвэрансаў. Гэтыя якасьці ён прадэманстраваў на пасадзе міністра ўнутраных спраў, калі ўтаймоўваў знакаміты «бунт прадмесьцяў».

Нашае начальства любіць апраўдваць гэтым прыкладам жорсткасць АМАПу, які разганяе акцыі апазыцыі. Параўнаньне, аднак, кульгае на абедзьве нагі. У Францыі забурэньні, што вызначаліся разгулам вандалізму, зладзілі імігранты, пераважна з Паўночнай Афрыкі. Ці можна з тым кантынгентам, які спаліў тысячы легкавікоў, параўноўваць удзельнікаў Дня Волі, якія нават вуліцу пераходзілі на зялёнае сьвятло? Французскія ўлады намагаюцца даць рады перасяленцам, якія ня могуць ці ня хочуць інтэгравацца ў тамтэйшы соцыюм, а ў беларускай дзяржаве рэпрэсуюць акурат носьбітаў беларушчыны!..

Што ж да Сарказі, дык ён мае распаўсюдзіць свой энэргічны стыль і на замежную палітыку. У прыватнасьці, дэманструе гатовасьць падштурхоўваць Брусэль да болей дзейснай стратэгіі ў беларускім пытаньні. Вось ягоны характэрны пасаж на гэты конт, што прагучаў некалькі месяцаў таму: «Кажучы пра пэрспэктывы Эўразьвязу, мы павінны найперш казаць не пра пашырэньне межаў, а пра пашырэньне прынцыпаў, на якіх грунтуецца Эўразьвяз. На мапе Эўропы ёсьць такія краіны, як Беларусь, дзе няма свабоды і дэмакратыі, дзе ўлада ўжывае рэпрэсіі супраць уласнага народу. Эўропа мусіць зьмяніць сваё стаўленьне да праблемы Беларусі. Сёньня не дастаткова проста маральных жэстаў, неабходная палітычная абарона Беларусі, мы павінны ў гэтым кірунку выкарыстаць усе дыпляматычныя магчымасьці краінаў — сяброў Эўразьвязу».

Больш таго, Сарказі даў зразумець, што, адрозна ад свайго папярэдніка Шырака, ня мае намеру гуляць з Крамлём. Вось ягоная фраза, якая не патрабуе асаблівага камэнтаваньня: «Калі вы хочаце ведаць, да каго я бліжэйшы — да ЗША ці да Расеі, якая паводзіць сябе так, як мы гэта бачылі ў Чачэніі, то я бліжэйшы да Злучаных Штатаў». Вашыгтон жа, як вядома, займае больш жорсткую пазыцыю ў дачыненьні да афіцыйнага Менску, чым Брусэль. Амэрыканскія палітыкі значна меней, чым добрыя эўрапейскія дзядзечкі, кшталту ван дэр Ліндэна, схільныя да ілюзіяў наконт здольнасьцяў Масквы станоўча паўплываць на беларускую ўладу.

Іншая рэч, што ніякі Сарказі ня вырашыць беларускія праблемы за саміх беларусаў. Сэ ля ві, спадарства!

**Аляксандар Класкоўскі**

### «Известия» пра Сарказі

**У часе дэбатаў з Руаяль Сарказі ні разу не сказаў «Расея». Затое ён узгадаў пра «чачэнскіх уцекачоў». На расейскі курс Сарказі могуць паўплываць ягоныя вугорскія карані. Наколькі новы прэзыдэнт, імігрант у другім пакаленьні, успадкаваў «генэтычную памяць» свайго бацькі, які зьбег з Вэнгрыі ад савецкіх танкаў? Як паказвае вопыт ЗША, палітыкі й палітолягі, продкі якіх нарадзіліся ва Ўсходняй Эўропе, часта ставяцца да Расеі перадузята.**



REUTERS

**...праблемы інвалідаў-калясачнікаў вырашаліся традыцыйным спосабам.**

— Віншую! Праблема інвалідаў–калясачнікаў вырашана. Перад вамі ўзор партыі браніраваных вазкоў для разгону шэсьцяў інвалідаў–калясачнікаў.







**...у беларусаў, як баіцца Ён, скралі перамогу.**

**...Кіркораў і Калдун перамаглі на Эўрабачаньні.**

— Што гэта з вамі, спадар Азаронак?

— Пасьля таго, як Калдун перамог, музычная тусоўка лічыць, што калі пабіць мяне перад выступам на нейкім конкурсе, гэта абавязкова прынясе ўдачу.



МАЛЮНКІ І ТЭКСТ ЛЁЛІКА УШКІНА

# Пераносм

Украіна і Беларусь мусяць агулам закупіць усе эстонскія шпроты на пяць гадоў наперад. З удзячнасьці. Піша **Аляксандар Фядута.**

Я не магу падтрымаць матывы, якімі кіраваўся эстонскі ўрад, пастанавіўшы перазахаваць парэшткі салдатаў. Але прыняўшы гэтае няслушнае, нясвоечасовае, палітычна выбуховае рашэньне, далей урад Эстоніі паводзіў сябе карэктна.

Помнік перанесьлі на могілкі без пашкоджаньняў. Прах перанесьлі без ганьбаваньня. 8 траўня, як і абяцалі, кіраўнік ураду ўсклаў да манумэнта вянок.

Я маю прэтэнзіі да матываў, але ня маю прэтэнзіяў да дзеяньняў.

Палітычнае глупства было выканана абсалютна культурна. Калі не лічыць пагромаў крамаў, пабітых дэманстрантаў (беларускага АМАПу на іх не было), паралізаванага эстонскага пасольства ў Маскве. І трупа расейца.

Апошняе — падзея выключная. Як распавядаюць — зноў-такі, расейскія — сродкі масавай інфармацыі, ён браў удзел у акцыях пратэсту і загінуў. Эстонскія СМІ, верагодна, нешта і кажуць, але мы ня ведаем іхнай мовы, ня чулі, у большасьці выпадкаў, пра іхнае існаваньне, а сама Эстонія займае ў нашай сьвядомасьці настолькі нязначнае месца, што калі нешта і чулі, дык — забылі.

Але ж пра забітага забыць цяжка. Немагчыма. І Расея, вуснамі сваіх дыпляматаў і журналістаў, працягвае пра гэта нагадваць.

Вядома ж, яна тут дае рады нашмат лепей, чым Эстонія. Як той казаў, хто на што вучыўся. І хто чаго вучыўся.

Расея вывучылася асноваў прапаганды і агітацыі.

Эстонія — асноваў эканомікі.

Таму эстонскі ўрад адказаў проста. У той самы дзень, 8 траўня 2007 году, прэм’ер-міністар Эстоніі адмовіўся сустрэцца з былым канцлерам Шродэрам. Вельмі моцны ўдар.

Не па Нямеччыне ўдар. Па Расеі. Таму што сп.Шродэр ужо даўно ня сябар «сусьветнага Палітбюро», затое значыцца на службе ў расейска-нямецкім газатранспартным прадпрыемстве.

Абмяркоўваць расейскі службоўца сп.Шродэр, трэба меркаваць, меўся пытаньні будаўніцтва газаправоду па тэрытарыяльных водах, што кантралююцца Эстоніяй. Зь ім не захацелі размаўляць.

Не таму што Шродэр — чалавек непрыемны. Не. Наадварот, прыемны ва ўсіх адносінах, як славутая гогалеўская дама. Але ён значыцца на службе ў расейскім СП (такі ў яго статус цяпер). А з Расеяй гутарка асаблівая. Вы, спадарове, патрабавалі байкоту эстонскіх шпротаў? Байкатуйце. Адказ мае закрануць вашыя эканамічныя інтарэсы.

Асабістыя інтарэсы сп.Пуціна. Таму што мала хто меў сумневы, што ён сыдзе ў той самы кансорцыюм, што і ягоны нямецкі сябра і недзе нават паплечнік, — адразу па заканчэньні прэзыдэнцкага тэрміну. І ў гэтай якасьці яны будуць па-ранейшаму кіраваць Эўропай — праз вэнтыль на газавай трубе.

Абодвух паставілі на месца. Ідэалягічнай вайне проціпаставілі вайну эканамічную. Давайце пахаваем усіх салдатаў, а потым і будзем размаўляць.

У расейска-эстонскай вайне загінуў усяго адзін чалавек — гэты самы Дзьмітры Г. Дзякаваць Богу, што толькі адзін. Вось давайце яго пахаваем. Выясьнім, ці быў ён палітычнай ахвярай вар’яцкай нэафашыстоўскай палітыкі эстонскага ўраду, ці валанцёрам, які вырашыў пад шумок паўдзельнічаць у пагроме крамаў. А са Шродэрам сустрэнемся пазьней — няма куды сьпяшацца.

Украіна і Беларусь мусяць агулам закупіць усе эстонскія шпроты на пяць гадоў наперад. З пачуцьця ўдзячнасьці. Чым болей ня будзе працаваць паўночнаэўрапейскі газаправод, тым прасьцей жыць гэтым манапалістам транзытнага бізнэсу. Ёсьць чым таргавацца з Расеяй.

Сама ж Расея ў такой сытуацыі выглядае як мала годны пераемнік Савецкага Саюзу. Ва ўмовах, калі ў СССР існаваў ідэалягічны стрыжань сыстэмы — тая самая камуністычная ідэалёгія, — усе прапагандысцкія войны мелі сэнс. Цяпер камуністычны Саюз распаўся. Расею прынялі ў шэрагі цывілізаваных звышдзяржаваў. Яна ж паводзіць сябе ня проста недарэчна — на шкоду ўласным фінансавым і геапалітычным інтарэсам. Ці вы можаце ўявіць слана, які брэша на моську? Вось,

**Працяг на старонцы 19.**

МЫ САМІ

# Дзякуй

**Алене П.** зь Менскага раёну.
**З.К.** з Крупак.
**Алене М.** зь Бярозаўскага раёну.
**А.Б.** з Магілёва.
**Міхаілу Т.** са Слуцку.
**С.М., В.М.** з Маладэчна.
**З.М.** з Валожынскага раёну.
**Віктару М., А.А.** з Баранавіч.
**Зьмітру Ж.** з Воршы.
**Віктару С.** з Ваўкавыску.
**Мікалаю К.** з Чэрвеньскага раёну.
**Ірыне З.** з Жодзіна.
**Мікалаю К.** з Валожынскага раёну.
**Любові Ш.** зь Віцебску.
**Сяргею Ц.** з Докшыцкага раёну.
**Ганьне Б.** з Пастаўскага раёну.
**Уладзімеру Д.** з Барысава.
**Уладзімеру В., Натальлі Б.** з Горадні.
**Генадзю Б.** са Шклоўскага раёну.
**У.С.** з Гомелю.
**Дар’і Л., А.З.** са Смургонскага раёну.
**Вадзіму Г., У.Л., Алене К., І.Л., Л.К., Аляксандру Ф., С.Д., Раману М., Лідзіі І., Андрэю А., А.Г., В.К., Аляксандру С., Яніне Л., Ніне Ш., Галіне Б., Тацяне П., Аляксандру Г., Уладзімеру Г., Віктару П., Натальлі Ж., Паўлу Д., Віталю С., Алене К., Т.П., Дзянісу Ш., Э.К., А.П., Віталю С., Міхаілу Ж., Юр’ю Б., Аляксандры Г., Міхаілу А., Р.С., Марыі А., Паўлу Д., К., Альберту С., Д.П., Ігару Б., Веры С., Аляксандру К., А.Б.** зь Менску.

## ПЫТАНЬНЕ — АДКАЗ

### У прафсаюз — толькі зь пісьмовай згоды працаўніка

**Добры дзень, паважаная рэдакцыя!** Піша вам чытач зь няшматгадовым стажам. Хачу распавесьці пра непрыемную сытуацыю, якая склалася на прадпрыемстве, дзе я працую. Я інжынэр, працую на дзяржаўным праектным прадпрыемстве. Цягам апошняга месяца амаль усіх супрацоўнікаў у добраахвотна-прымусовым парадку загналі ў прафсаюз. Тых, хто не ўвайшоў, пагражаюць пазбавіць ільготаў і наддаткаў, тлумачачы гэта тым, што на такіх супрацоўнікаў не распаўсюджваецца дзеяньне новай калектыўнай дамовы. Нас ужо выклікалі да сябе і загадчык аддзелу і галоўны інжынэр. Перад намі размахвалі нейкімі камэнтарамі Канстытуцыйнага суду пра законнасьць такіх рашэньняў. З 1 траўня пачнуць скасоўваць усе гэтыя льготы. Можа, вы параіце, куды зьвярнуцца, або напішаце камэнтар праўнікаў. З павагай, Андрэй

«НН» зьвярнулася па камэнтар да лідэра Беларускага незалежнага прафсаюзу ААТ «Горадня-Азот» Сяргея Антусевіча. Сп.Антусевіч пераслаў у рэдакцыю адказ першага намесьніка міністра працы і сацыяльнай абароны А.Коласа на запыт Беларускага незалежнага прафсаюзу па пытаньні распаўсюджаньня ўмоваў калектыўнай дамовы на супрацоўнікаў, ад імя якіх яна не ўкладалася.

Паводле арт.365 Працоўнага кодэксу (далей — ПК), калектыўная дамова распаўсюджваецца на наймальніка і ўсіх работнікаў, ад імя якіх яна ўкладзеная. Дзеяньне калектыўнае дамовы распаўсюджваецца на работнікаў, ад імя якіх яна не ўкладалася (нядаўна прынятых і інш.), на той умове, што яны выкажуць сваю згоду пісьмова.

Як відаць з гэтай нормы, пры распаўсюджваньні калектыўнае дамовы на работнікаў, ад чыйго імя яна не ўкладалася, заканадаўствам вызначаная толькі адна ўмова — пісьмовая згода работніка. Згода бакоў (наймальніка і прафсаюзу), што ўклалі калектыўную дамову, на яе распаўсюджаньне на вышэйменаваных работнікаў заканадаўствам ня ўлічаная. Праўнае значэньне тут мае толькі згода саміх работнікаў. Іншае трактаваньне паказаных нормаў заканадаўства непазьбежна азначала б пагаршэньне становішча работнікаў, ад чыйго імя калектыўная дамова не ўкладалася, а гэтага дапускаць нельга.

Артыкул 14. Забарона дыскрымінацыі ў сфэры працоўных дачыненьняў.

Дыскрымінацыя, то бок абмежаваньне ў працоўных правах ці атрыманьне якіх-кольвек перавагаў залежна ад полу, расы, нацыянальнага паходжаньня, мовы, рэлігійных ці палітычных поглядаў, удзелу ці няўдзелу ў прафсаюзных ці іншых грамадзкіх аб'яднаньнях, маёмаснага ці службовага становішча, недахопаў фізычнага ці псыхічнага характару, якія не перашкаджаюць выкананьню адпаведных працоўных абавязкаў, забараняецца.

Дыскрымінацыйныя ўмовы калектыўных дамоваў і пагадненьняў несапраўдныя.

Асобы, якія лічаць, што яны папалі пад дыскрымінацыю ў сфэры працоўных дачыненьняў, маюць права зьвярнуцца ў суд з адпаведнай заявай пра ўстараненьне дыскрымінацыі.

Кантакты праўнікаў незалежных прафсаюзаў:

Намесьнік старшыні Незалежнага прафсаюзу гарнякоў па праўных пытаньнях Каралёў Аляксандар (Салігорск), тэл.: 8-017-10-231-53.

Праўнік гарадзенскага Незалежнага прафсаюзу Парадкаў Аляксандар, тэл.: 8-0152-79-44-88.

**СП**

### З гонарам і бяз страт

**Цяпер, калі судзьдзя Людміла Савасьцян вынесла пастанову пра штраф Анатолю Ляўковічу, можна больш шырока і адкрыта напісаць пра тое, як сацыял-дэмакраты сьвяткавалі гэтак званы Дзень працы** (усюды гэта Дзень салідарнасьці працоўных; раней і ў СССР ён называўся так, але пасьля распаду Саюзу яго «перахрысьцілі»).

Заяўку на сьвяткаваньне Першамая падавалі камуністы. Яны вырашылі арганізаваць усё самі. Сацыял-дэмакраты былі пастаўленыя перад фактам. Ім заставалася або праігнараваць камуністычную акцыю, або быць гасьцямі на ёй, або самім падаць заяўку. Але заяўку падаваць было позна. Было вырашана ўдзельнічаць у сьвяткаваньні, але так, каб усе бачылі, што гэта ідуць сацыял-дэмакраты, што гэта мітынгуюць сацыял-дэмакраты.

Тым часам дэманстрацыя уладамі была забаронена. Арганізатарам сьвяткаваньня прапанавалі правесьці маёўку. І арганізатары згадзіліся.

Практыка паказала, што ўладу ўдаецца перахітрыць, паставіўшы перад фактам, і што акцыя ўдаецца, калі яе праводзяць аднадумцы і калі пра сцэнар ведаюць адзін-два чалавекі.

Сацыял-дэмакраты сьцягваліся да вуліцы Багдана Хмяльніцкага. Гэта насупраць Акадэміі навук. Вуліца выходзіць да трамвайных шляхоў, што на вуліцы Якуба Коласа. І калі трохі збочыць, пачынаецца вуліца Сурганава.

Ад скрыжаваньня вуліц Якуба Коласа і Сурганава і пачалося шэсьце сацыял-дэмакратаў. Пад партыйнымі сьцягамі (а гэтых сьцягоў, паводле маіх падлікаў, было ня менш як 50 — 22 з офісу БСДП, 21 берасьцейскі, 10 віцебскіх...) калёна прайшла да плошчы Бангалор і ўвайшла ў парк Дружбы народаў.

Вось у гэты момант, калі калёна БСДП ужо пераходзіла вуліцу Максіма Багдановіча, Сяргей Калякін адкрываў мітынг і заклікаў прысутных пачакаць, пакуль падыдуць сацыял-дэмакраты.

Пра тое, што сацыял-дэмакраты зьбяруць сваю калёну і што гэтая калёна пройдзецца па вуліцы, арганізатары акцыі не паведамлялі нікому, а найперш прэсе, бо яна разазваніла б пра гэты намер усяму сьвету. А таксама прэса ўведала, што сацыял-дэмакратычная калёна рухалася пад сваімі сьцягамі па вуліцы толькі ў дзень затрыманьня і суду над Анатолем Ляўковічам. Але больш істотна, што пра гэта загадзя ня ведала менская міліцыя грамадзкай бясьпекі і палкоўнікі Найдзенка ды Падабед. Найдзенкава-Падабедавы людзі ў гэты дзень адпачывалі. Рух калёны быў зафіксаваны толькі даішнікамі.

Служба Найдзенкі-Падабеда спахапілася пасьля Першамаю. І відаць, што ёй дапамаглі здымкі на сайтах электронных СМІ. На гэтых здымках (зробленых, што праўда, у парку) яна магла сяготага апазнаць. Але служба Найдзенкі-Падабеда не магла, як заўсёды, выставіць сваіх вывучаных «сьведак». Яна вымушана была прасіць пра гэта даішнікаў. А раз даішнікі навучаныя сачыць больш за машынамі, чым за людзьмі, дык ня дзіва, што ў судзе супрацоўнік ДАІ Зьміцер Максіменка «не апазнаў спадара Ляўковіча, а паказаў на ягонага паплечніка», як піша карэспандэнтка радыё «Свабода». «Прычым, — удакладняе карэспандэнтка, — ён зрабіў гэта двойчы, калі судзьдзя папрасіла яго паказаць правапарушальніка».

Да прыходу калёны сацыял-дэмакратаў над сабранымі луналі толькі два-тры бел-чырвона-белыя сьцягі. Гэта былі сьцягі «Маладога фронту». З прыходам сацыял-дэмакратаў на пляцоўцы пасьвятлела. І міжволі згадаліся словы Янкі Брыля: «У сьцягах нашых многа сьвятла».

Зрэшты, у кожнага сваё бачаньне. Так, карэспандэнт «Нашай Нівы» лічыць, што камуністычныя сьцягі пераважалі. Пры гэтым газэта зьмясьціла здымак, на якім відаць адзін камуністычны, адзін нацыянальны і зь дзясятак сьцягоў БСДП. І чуе кожны па-свойму. Той самы карэспандэнт напісаў, што на мітынгу па-беларуску прамаўляў толькі адзін Сяргей Скрабец. А выступу Анатоля Ляўковіча ён так і не пачуў.

Але больш важна адзначыць, што, акрамя Анатоля Ляўковіча, не пацярпеў ніводзін удзельнік Першамайскага шэсьця. Сацыял-дэмакраты прайшлі дыстанцыю з гонарам і бяз страт. Рэдкі выпадак.

**Анатоль Сідарэвіч**

### Нашыя работнікі яшчэ не загаварылі

**У матэрыяле «Чарнобыль працягвае забіваць» (Наша Ніва. 2007. 13 красавіка) прыводзяцца цікавыя зьвесткі, але высно,а, што першы раз за доўгі час дзяржаўны работнік парушыў маўчаньне на тэму здароўя жыхароў чарнобыльскіх тэрыторый, патрабуе ўдакладненьня.**

Працытаваная ў тэксьце Э.Капітонава ад 23 лютага больш не

зьяўляецца дырэктаркай Цэнтру радыяцыйнай мэдыцыны (сышла на пэнсію), але застаецца кіраўнічкай беларуска-амэрыканскага праекту зь беларускага боку. Праект ажыцьцяўляецца ў мэтах збору інфармацыі аб узьдзеяньні наступстваў Чарнобылю на здароўе чалавека і фінансуецца ўрадам ЗША. Такім чынам, маем парушанае маўчаньне работніка амэрыканскай дзяржавы. Нашыя ж работнікі, на жаль, пакуль яшчэ не загаварылі.

Што да публічнай дыскусіі наконт эфэктыўнасьці дзяржаўнай палітыкі пераадольваньня наступстваў аварыі. У нас за асноўны напрамак была прынятая барацьба з радыёфобіяй. Існуе насьцярожанасьць да людзей з пацярпелых рэгіёнаў, якая часта ёсьць вынікам нястачы інфармацыі. Напрыклад, ці бясьпечна прыняць на месяц у сям'ю дзіця з зоны забруджваньня? Ці перадаецца радыяцыя праз адзежу, матрац, дзіцячыя цацкі, ліставаньне? Ці гэта навука маўчыць на гэтую тэму, ці такія пытаньні нецікавыя для мэдыяў?

Праз надуманыя перасьцярогі людзі з «зоны» пачуваюцца людзьмі другога гатунку і ўдзячныя кожнаму, хто скажа, што ўзровень радыяцыйнага забруджваньня зьніжаецца, небясьпека мінае...

А ва Ўкраіне на забруджаных тэрыторыях мужчыны ідуць на пэнсію ў 54 гады, а жанчыны — у 49. Адэкватная мера. І вызваляюцца працоўныя месцы. Вось і гатовая тэма для публічнай дыскусіі, якой нам сапраўды нестае.

**V.C., Гомель**

## У камуфляжным грамадстве

**Ня дзеля ўласнага гонару будзе сказана, але як адзіны беларускамоўны жаўнер на ўсю брыгаду, я выклікаю ўвагу сярод усяго вайсковага грамадства, а пры знаёмстве з новымі людзьмі я амаль што заўсёды сутыкаюся з адзіным шэрагам лягічных пытаньняў:**

— Пэўна, ты зь вёскі?

— Так, зь вёскі! — адказваю, разумеючы, што суразмоўцу зачапіла мая незвычайная гаворка.

— А адкуль? А ў вас там усе па-беларуску гавораць? Не? Дык, пэўна, ты навучаўся ў беларускамоўнай школе? А бацькі? Размаўляюць па-расейску?

Першае ўражаньне: хлопец зь вёскі, які гаворыць па-вясковаму і проста ня ведае райсейскай мовы. А потым зьдзіўленьне!

— Як? З вышэйшай адукацыяй і размаўляеш па-беларуску ўсяго паўтара году? А чаму пачаў?! — надыходзіць новы шэраг пытаньняў.

Даводзіцца грунтоўна тлумачыць, што размаўляць па-беларуску зусім ня лёгка, і ішоў я да гэтага яшчэ са школьных гадоў, а чаму — дык на гэта пытаньне даўно выпрацаваўся канкрэтны адказ: «Лічу беларускую мову роднай. Ці я не магу размаўляць на роднай для сябе мове? Каб яна жыла і разьвівалася, патрэбныя беларускамоўныя людзі!»

«Выбачайце! — кажу тым, хто настойліва ўпрошвае перайсьці на расейскую. — Значыць, будзем маўчаць!» Можа, гэта і няправільна, але ісьці на кампраміс у гэтым пытаньні я магу толькі з тымі, хто сапраўды не разумее маёй гаворкі, а такіх аказваецца вельмі мала, што ня можа ня радаваць.

Сярод усяго камуфляжнага грамадзтва, зь якім мне давялося пазнаёміцца, толькі адзінкі пакінулі непрыемныя пачуцьці. Астатнія ці падтрымлівалі мяне, ці, лічачы сьцёбным размаўляць па-беларуску, усё ж такі задумваліся над пытаньнем важнасьці мовы, на якой размаўляеш. На жаль, не паболела беларускамоўных жаўнераў, бо, насамрэч, гэта цяжка размаўляць па-беларуску сярод цалкам расейскамоўнага грамадзтва, нават для мяне, бо сам часам пераходжу на трасянку.

Але радуе тое, што беларуская мова жыве. Хоць і сьпіць, але жыве! Жыве сярод вясковых пустак, пакідаючы ў галовах вяскоўцаў асобныя словы ды выразы, якія дзе-нідзе ды самавольна ўскочаць у гутарку. А таму ў нас яшчэ шмат працы, каб паказаць, наколькі мілагучная і звонкая нашая мова. А на пачатку варта размаўляць па-беларуску паўсюль і не баяцца, што цябе не зразумеюць. (Не разумеюць — паўтары яшчэ раз, ужо па-расейску, бо ня іх віна, што мовы ня ведаюць). Быць талерантным і не ісьці на канфлікт — гэта цяжка, але колькі прыемных момантаў можна спаткаць на сваім нялёгкім шляху.

Зусім іншая сытуацыя з маёй палітычнай пазыцыяй. Падтрымкі тут значна меней: цяжка зразумець простаму вясковаму хлопцу, чым я не задаволены. А мне цяжка ўжо і растлумачыць, бо для мяне з кожным днём становіцца ўсё больш віртуальным маё звычайнае жыцьцё (так званая «гражданка»), а я ўсё больш станаўлюся «віртуальным» для сваіх сяброў.

Слова «апазыцыянер» у большасьці асацыюецца з БНФ і «адмарозкамі, якія выходзяць на плошчы». А праз тое, што я быццам бы да адмарозкаў не падыходжу, мяне адносяць да БНФ.

Ды і пазыўны мне доўга не давялося прыдумляць. «БНФ» дык «БНФ». Што ж, хоць я не адношуся да гэтай партыі, мне прыемна. Прыемна адчуваць гонар за Пазьняка, які ў адначасьсе стаў «ворагам народу» і ўтварыў самую пазнаваемую народам партыю нават цяпер, калі ўплыў БНФ у апазыцыі адносна невялікі. Большасьць жа жаўнераў, якім цікава размаўляць са мною на палітычныя тэмы, проста баяцца, што пры зьмене ўлады будзе горш. І я не магу зь імі не пагадзіцца. Будзе крызіс, як палітычны, так і эканамічны, але мы стаім пад пагрозай страты незалежнасьці. І лепей цяпер зламаць руку (зьмяніць уладу, выклікаўшы крызіс), чым праз некалькі гадоў перабіць хрыбет (крызіс сам паглыне краіну і ня будзе бачна іншага выхаду, як увайсьці ў склад Расеі).

Яшчэ шмат розных момантаў (прыемных і непрыемных) падаравала мне войска, але пакуль аб іх лепей маўчаць. ДМБ не за гарамі.

**Юрка Бакур, Горадня**

## ЭГУ запрашае ў магістратуру

Эўрапейскі гуманітарны ўнівэрсытэт (Вільня, Літва) запрашае асобаў з вышэйшай адукацыяй і студэнтаў выпускных курсаў беларускіх ВНУ паступаць на магістарскія праграмы ЭГУ.

У 2007 г. унівэрсытэт прымае на наступныя праграмы: «Міжнароднае права і эўрапейскае права», «Эўрапейскія дасьледаваньні», «Дэмакратыя і грамадзянская супольнасьць», «Сацыяльная тэорыя і палітычная філязофія», «Культурныя дасьледаваньні», «Ахова і інтэрпрэтацыя культурнае спадчыны» і «Параўнальная гісторыя краінаў Паўднёва-Ўсходняе Эўропы». Тэрмін навучаньня — 2 гады. Форма — вочная (4–5 двухтыднёвых сэсіяў у год у Літве і дыстанцыйная праца між сэсіямі).

Навучаньне бясплатнае. На час сэсіі ўнівэрсытэт забясьпечвае месцам у інтэрнаце, пакрывае выдаткі на мэдычную страхоўку і спрыяе ў атрыманьні візы.

Дакумэнты прымаюцца ў дзьве плыні ў электронным фармаце: у першай плыні — да 30 чэрвеня, у другой (на астатнія месцы) — да 5 верасьня ўлучна. Пачатак навучальнага году 1 кастрычніка 2007 г.

Падрабязьней на сайце ЭГУ: http://www.ehu.lt/studies/master.

# Перанос

**Працяг са старонкі 17.**

гэта Расея перад Эстоніяй. Мабыць, яны гэтага не хацелі, але — так выйшла.

Каб не сварыцца з Амэрыкай ці Вялікабрытаніяй, давайце адцягнемся на Эстоніі! «Не пачулі» аднаго «нюансу»: гаворка ад пачатку ішла не пра ЗНОС помніку, а пра ягоны ПЕРАНОС. Пра цывілізаваную працэдуру.

Дык і паводзьце сябе цывілізавана.

Не захацелі. Сьвядома — не захацелі.

Вось вам.

Уся гэтая расейская гістэрыя выглядала нягегла і нават сьмешна. Першы віцэ-прэм'ер, міністар замежных справаў, мэр сталіцы, сьпікеры абедзьвюх палат парлямэнту выступаюць па тэлевізіі — пра што?!

Цяпер не загаворыш пра інтарэсы «Газпрому». Гэтага ўжо псыхіка сярэднестатыстычнага расейца не перанясе. Гэта будзе выглядаць як спроба наладзіць дыялёг з тымі, каго «нашысты» менавалі «фашыстамі» і чыю кільку адмаўляецца спажываць Юры Лужкоў з прынцыповых меркаваньняў. То бок самі ж сабе на хвост змушаныя будуць наступіць.

Вой, *веліка Федора, да дура*...

Не, пэўна, Лукашэнка мусіць запрасіць свайго эстонскага калегу на кубачак гарбаты з кілішкам «Старога Таліна». Хоць гэтага Расея і зусім не стрывае.

# Альбом памяці 2006 году

Лідэр NRM Лявон Вольскі расказвае пра новы альбом гурту.

**«Наша Ніва»: Калі фанаты NRM змогуць патрымаць у руках новы альбом гурту?**

**Лявон Вольскі:** На наступным тыдні. Хаця на апошнім этапе працы былі праблемы: мастэрынг рабілі ў швэдзкім Гётэборгу, а тамака паблыталі разьмяшчэньне песень. Мы адсылалі матэрыял назад у Швэцыю. Выдадзены альбом будзе ў Польшчы. Запісваліся ж цалкам у Беларусі. Альбом будзе называцца «06».

**«НН»: Чаму такая назва?**

**ЛВ:** На альбоме песні, створаныя ў 2006 годзе. Падзеі на Плошчы натхнілі нас. Яшчэ гэта шосты нумарны альбом NRM. Наш бубнач Алезіс знайшоў шмат сэнсаў гэтай лічбы. І бязьмежнасьць, і крыж. Ён нас і пераканаў.

**«НН»: Кулінковіч пра кожны свой новы альбом кажа, што ён найлепшы. Вы можаце сказаць гэта пра «06»?**

**ЛВ:** Пакуль ён не намуляў вушы, я з задавальненьнем магу яго слухаць. Потым стомісься, і стане зразумела, што будзем выконваць на канцэртах, а што — не.

Альбом вельмі рознастылёвы. Ад злосьці і нянавісьці да каханьня. Раней мы асьмельваліся рабіць такое толькі ў супольных праектах. Некалькі кампазыцый выразна рэвалюцыйных («Гадзючнік», «Дахалеры»), можа, і будуць крыху неадэкватнымі, але пісаліся ў час значных для Беларусі палітычных падзеяў. Адсейваць такія песьні лічу глупствам, гэта значная частка нашага жыцьця.

Апошнюю песьню «Мама-тата» хорам сьпяваюць дзеці ўдзельнікаў гурту. Алезісаву песьню «Кітай» я выконваю на бубнах. «Менск — Мінск» можна лічыць тыповай дваровай песьняй. «Толькі для цябе» — баляда, «Свабоды глыток» — нейкі джазблюз. Толькі гіп-гоп не пасьпелі запісаць.

**«НН»: Як такую рознастылёвасьць успрымуць фанаты?**

**ЛВ:** Дачка нашага сябра Міхала Анемпадыстава сказала, што альбом — суцэльная папса, апроч песьні «Гімн беларускага рок-н-рольшчыка». На мой погляд, менавіта яна самая папсовая. Гэта ня наша песьня, мы ўзялі яе з сайту «Музыкальной газеты». Песьню напісаў нейкі Зьміцер. Я шукаў яго праз інтэрнэт, пытаўся на канцэртах, але ніхто не адгукнуўся. Мо праз «НН» знойдзецца. Я пэўны ў гэтых песьнях: гэта ж ня пошукі таннай славы. На тэлевізіі і радыё нас ніхто не паставіць, навошта рабіць папсовыя рэчы. А ў шаснаццаць гадоў я таксама пачаў бы абвінавачваць NRM у папсовасьці.

**«НН»: Чаму так доўга пісалі альбом? Цэлыя пяць гадоў.**

**ЛВ:** Разумееце, гэта ж ня праца на фабрыцы. Былі асобныя песьні, але дапісваць да іх нешта яшчэ, дабіваць альбом, было б несумленным з нашага боку. У творчасьці калі ня прэ, то значыць — ня прэ, і нічога з гэтым ня зробіш. Калі ёсьць некалькі старых песьняў, то няхай яны лепш паляжаць, чым рабіць няякасны прадукт.

**«НН»: Канцэрты ў падтрымку альбому пляную-юцца?**

**ЛВ:** Мяркуем правесьці канцэрт недзе да канца чэрвеня. Трэба пільна сачыць за абвесткамі ў інтэрнэце, бо афішаў ня будзе.

**«НН»: Вам ня крыўдна, што даводзіцца граць у маленькіх кухонных клюбах?**

**ЛВ:** Што датычыць маленькіх клюбаў, ня крыўдна, бо там мы маем ні з чым не параўнальную абстаноўку. Вялікія канцэрты мы даём за мяжой. Шкада: гэтая музыка ствாралася для грамадзянаў гэтай краіны, імі ж яна найлепш разумеецца. Але для NRM немагчыма атрымаць у Менску нармальную пляцоўку для выступаў. Дырэктары FM-станцый самі прыдумляюць нейкі фармат. Для іх ужо любая беларускамоўная песьня — нефармат. Гэта поўны абсурд.

**«НН»: А на канцэртах «За Беларусь» не хацелася б сыграць?**

**ЛВ:** Дык не запрашаюць. А спакуса заўсёды ёсьць, выйсьці і натварыць там такія рэчы! (Сьмяецца). Некалі раней спрабавалі запрасіць «Крамбамбулю», але да канкрэтнай прапановы справа не дайшла.

**«НН»: А ў Беларусі ўвогуле магчыма зарабляць на жыцьцё музыкай?**

**ЛВ:** З кожным годам становіцца ўсё цяжэй. Для гэтага трэба мець некалькі ўжо раскручаных праектаў. З нуля — нерэальна. У нас

**Пра незалежны спадарожнікавы канал**

Хай людзі глядзяць ня толькі тое, як у нас усё добра, бульба вялікая, а навокал катастрофы ды неўраджаі. Але справа яшчэ ў тым, што не ва ўсіх ёсьць магчымасьць глядзець спадарожнікавыя каналы: вось у мяне, напрыклад, зламалася антэна, і рукі ніяк не даходзяць яе адрамантаваць. Дык цяпер паказваюць толькі 5 каналаў: усе, вядома ж, дзяржаўныя. Спачатку я сьмяяўся з гэтае штохвіліннае прапаганды, але цяпер ужо і не да сьмеху.

Людзі, заточаныя пад БТ, і надалей будуць глядзець БТ. Таксама як людзі, звыклыя да унівэрсамаў, ня будуць купляць тавары праз інтэрнэт. Такім чынам, гэты праект зь незалежным спадарожнікавым каналам хутчэй для тых грамадзян, якія хочуць альтэрнатыўнай інфармацыі, але ня могуць яе атрымаць.

**Пра сытуацыю ў краіне**

У нас цяпер застой, нічога не адбываецца, усё ціхенька. Я пару дзён таму з Амэрыкі вярнуўся і зірнуў на ўсё нібы збоку. Навіны: выступаюць па тэлебачаньні адны і тыя ж, сідорскія, пракаповічы... І тут раптам — раз! — Лукашэнка выступіў, і пайшлі навіны: ён сказаў гэта, сказаў тое. Вось і ўсе навіны ў Беларусі: «Выступіў Лукашэнка і сказаў…»

**Пра Сакавік-2006**

Мы хадзілі на Пляц, як на любімую працу, падтрымлівалі маладых людзей, сьмяшылі іх, дадавалі пазытыву, развучвалі разам песьні... Карацей, год запомніўся.

**Юрась Бусел, Алесь Квіткевіч**



увесь шоў-бізнэс крыху мястачковы. Гэта відаць па ўсіх канцэртах «За Беларусь».

**«НН»: Ці згодныя Вы зь меркаваньнем, што сапраўдны рок застаўся толькі ў Беларусі і нідзе болей?**

**ЛВ:** Гадоў пяць таму гэтая фраза яшчэ была б актуальнай. Калі беларускія гурты прыяжджалі ў Эўропу і давалі там чаду. У Эўропе думалі, што вось нашы каманды зусім ужо камэрцыйнымі сталі, а ў Беларусі — не. Змагаюцца зь нечым. Але ж не дзесяцігодзьдзямі змагацца. Тады ўжо атрымліваюцца прафэсійныя рэвалюцыянэры. Змагацца, канечне, трэба, але, разам з тым, трэба шукаць новыя шляхі ў тэкстах, музыцы.

**«НН»: Як цяпер NRM успрымаюць у Эўропе?**

**ЛВ:** У Эўропе цікавяцца ўсім, што зьвязанае зь Беларусьсю. Яны любяць паглядзець на нейкую экзотыку. У Бэрліне арганізатары заўсёды спэкулююць на тым, што гэта рэвалюцыйны гурт, забаронены на Радзіме і г.д. І людзі, канечне, ідуць паглядзець на монстраў. Яны думаюць, што мы выйдзем зь перабінтаванымі галовамі, зь сінякамі пад вачыма. Эўрапейскія СМІ, якія пішуць пра нашы выступы, спэкулююць на выразах кшталту «гурт з дыктатарскай краіны». У Эўропе папросту ёсьць мноства людзей, якія зарабляюць грошы на нашай дыктатуры. Цяпер ужо пачынаюць хадзіць на брэнд NRM. У Польшчы мы калі не на вяршыні гары, то, прынамсі, пасярэдзіне. У Амэрыцы на апошнія канцэрты прыйшла ў асноўным маладая эміграцыя.




**Вокладка новага альбому «NRM».**

**«НН»: Вы пачуваецеся жывой легендай беларускага року?**

**ЛВ:** Не пачуваюся. Легенды ня езьдзяць на «субару» 1993 году, яны езьдзяць на «лінкольнах», і не жывуць у аднапакаёвых кватэрах. Каб стаць легендамі, трэба, каб у нас склалася сытуацыя хаця б як ва Ўкраіне. «Океан Ельзи» — ужо жывая легенда ўкраінскага року. А вось «Воплі Відаплясава» — чамусьці не. Я нават ніколі не пачуваўся зоркай. Можа, гэта і мой мінус, але гэта праўда. Музыкам добрым я сябе лічу, выканаўцам, можа быць, і ня вельмі.

**«НН»: Што зьмянілася ў гурце між першым і шостым альбомамі?**

**ЛВ:** Мала што. Хіба што крыху зьмяніліся адносіны між удзельнікамі. Мы ня ходзім на дні нараджэньня адзін да аднаго. Затое ходзяць нашы дзеці, і нам усё адно даводзіцца там сустракацца. Я ведаю, напрыклад, Алезіса ўжо больш за 20 гадоў: што ён скажа — я ведаю, што я скажу — ведае ён. Канечне, крыху стаміліся адзін ад аднаго.

**«НН»: Часта атрымліваецца зьбірацца разам дзеля рэпэтыцыі?**

**ЛВ:** Перад канцэртамі мы зьбіраемся два-тры разы, каб не аблажацца. Маглі б гэтага і не рабіць, але робім па-ранейшаму.

**«НН»: Ці ёсьць яшчэ сэнс у існаваньні NRM?**

**ЛВ:** Пэрыядычна такія думкі ўзьнікаюць. Аднак пакуль ідзе вытворчы працэс, спыняцца няма сэнсу. Некалі я ляпнуў, што ў дэмакратычнай краіне наш гурт нікому ня будзе патрэбны. Аднак сёньня я не хачу даваць такія прагнозы. Магчыма, перародзімся ў нешта іншае. Некалі я таксама сказаў, што пасьля 50 гадоў не зьбіраюся займацца рок-музыкай, цяпер я не магу так адназначна гаварыць. Кіну сьпяваць, толькі калі на Беларусь зваліцца камэта.

**Гутарыў Зьміцер Панкавец**

## Дабры бабры

Яшчэ адзін беларус прагрымеў на цэлы сьвет. Міліцыя ўзбудзіла крымінальную справу супраць 48-гадовага селяніна з Ухвалы, што на Крупшчыне, які голымі рукамі… задушыў бабра. Як выявілі ахоўнікі парадку, гэты мужык злавіў у рацэ бабра і задушыў яго рукамі. Крымінальная справа ўзбуджаная па артыкуле 281 Крымінальнага кодэксу (незаконная здабыча вадзяной зьверыны). З падазраванага ўзялі падпіску пра нявыезд.

## Абліў бацьку бэнзінам і падпаліў

Пракуратура Берасьця распачала крымінальную справу ў дачыненьні да 25-гадовага жыхара абласнога цэнтру, які абліў бэнзінам і падпаліў свайго 49-гадовага бацьку. Трагедыя здарылася ў адным з дамоў па вуліцы Луцкай вечарам 31 сакавіка. Мужчына памёр у больніцы на чацьвёрты дзень пасьля здарэньня.

## У Міры зладзяць 16 фэстываляў

На міжнародных фэстывалях сярэднявечнай культуры ў Міры чакаюцца рыцарскія клюбы зь Беларусі, Літвы, Латвіі, Польшчы і Расеі.

## Левыя прапануюць легалізаваць марыхуану

Саюз дэмакратычнай лявіцы (партыя Квасьнеўскага) прапануе легалізаваць у Польшчы марыхуану, гашыш і LSD. Паводле палітыкаў партыі, няма патрэбы абмяжоўваць доступ да лёгкіх наркотыкаў для ўласных патрэбаў. Левыя лічаць, што шкода ад лёгкіх наркотыкаў ня большая, чым ад алькаголю.

## У Берасьці суд за графіці

Старшаклясьніка адной з школаў затрымалі, калі ён маляваў графіці. Раней гэтага хлапчука прыцягвалі да адказнасьці за такое, таму супраць яго ўзбудзілі крымінальную справу па арт. 341 КК.

## Тоні Блэр стане акторам

Брытанскі прэм’ер задаволіць сваю цягу да тэатральнай творчасьці пасьля сыходу зь вялікай палітыкі. Як паведамілі інфармаваныя крыніцы, ён пагадзіўся на прапанову свайго блізкага сябра, мастацкага кіраўніка лёнданскага тэатру «The Old Vic» і знакамітага галівудзкага актора Кевіна Спэйсі выканаць адну зь вядучых роляў у п’есе «Горан» Артура Мілера, якая папярэджвае пра небясьпеку фундамэнталізму.

## Палёгка для інвалідаў

Кіраўнікам прадпрыемстваў, якія беспадстаўна адмаўляюцца браць на працу інвалідаў, пагражае штраф ад 20 да 50 базавых велічыняў. Адпаведную




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**У Менску прайшла аўтавыстава «Мотаршоў». Удзел узялі ўладальнікі 33 аўтамабільных брэндаў, якія выставілі 250 машын. Гэта рэкорд за ўсю гісторыю «Мотаршоў». У 2006 годзе беларусы набылі 10 тыс. новых аўтамабіляў.**



На паліваправодзе Ўнеча—Вэнтспілс у Бешанковіцкім раёне здарылася чарговая аварыя.

заканадаўчую норму прыняла палата прадстаўнікоў.

## «Ляпісы» прасьпявалі Кім Чэн Іру

У сталіцы Паўночнай Карэі Пхеньяне з 1 да 4 траўня прайшоў фэст «Рок дзеля міру». Беларускі гурт «Ляпіс Трубяцкі» прадставіў там новы альбом «Капітал». Новы дыск «Ляпісу» паступіў у продаж 1 траўня. У інтэрнэце зьявіўся кліп на песьню «Капітал», дзе паказваюць сусьветных дыктатараў — Кастра, Чавэса, Кім Ір Сэна, Ахмадзінежада, Лукашэнку. Кіраўнік Беларусі выяўлены на фоне сельгастэхнікі.

## У вялікіх гарадах людзі ходзяць усё хутчэй

Брытанскія дасьледчыкі зьмерылі хуткасьць, зь якой жыхары вялікіх гарадоў праходзяць 18 мэтраў. Самымі хуткімі гарадамі Зямлі аказаліся Сынгапур (10,55 сэкунды), Капэнгаген (10,82) і Мадрыд (10,89). Самыя марудныя — Блантыр у Маляві і Манама ў Бахрэйне. У Сынгапуры хуткасьць хады ўзрасла за 10 гадоў на 30%.

## Мошчы эвангеліста Лукі ў Менску

Сьвяты Лука паходзіў з адукаванай грэцкай сям’і, быў мэдыкам і ў хрысьціянстве традыцыйна лічыцца патронам усіх дактароў. Ён аўтар аднаго з Эвангельляў. Па легендзе, менавіта Лука напісаў першую ікону Найсьвяцейшай Багародзіцы, а таксама іконы Пятра й Паўла. Сьвяты Лука быў спадарожнікам апостала Паўла. Згодна з паданьнем, пасьля сьмерці апосталаў Лука пакінуў Рым ды з пропаведзьдзю прайшоў Грэцыю, Лівію, Эгіпет. У горадзе Фівы ён пакутна скончыў свой зямны шлях.

Дакладная дата прывозу мошчаў сьвятога Лукі ў Менск будзе вызначаная пазьней.

## Самая доўгая падводная высакавольтная лінія

У Нарвэгіі скончыліся працы па пракладцы найдаўжэйшай у сьвеце 580-кілямэтровай падводнай высакавольтнай лініі NordNed. Яна злучае рэгіён Осла ў Нарвэгіі з Галяндыяй.

**МБ; СП; Вольга Данішэвіч**

## Самсонаў выйграў Лігу чэмпіёнаў

Лідэр нашай зборнай па настольным тэнісе Уладзімір Самсонаў выйграў самы прэстыжны эўрапейскі клюбны турнір — Лігу чэмпіёнаў у складзе бэльгійскай каманды «Шарлеруа». У сусьветным рэйтынг-лісьце 31-гадовы Ўладзімер Самсонаў займае цяпер 6-е месца. Наперадзе ж — кітайцы.

## Мезін сыходзіць

Галкіпэр Мезін завяршае выступы за зборную Беларусі. Пасьля заключнага матчу зь немцамі ён заявіў: «Калі шчыра, думаў разьвітацца са зборнай ужо пасьля мінулага чэмпіянату. Два папярэднія форумы склаліся для мяне ўдала: хацелася скончыць на мажорнай ноце выступленьне ў нацыянальнай камандзе. Тым ня менш, час паказаў, што лепш было застацца дома», — з горыччу заявіў ён газэце «Прессбол».

Гульня Мезіна на маскоўскім чэмпіянаце была адной з самых няўдалых.

## Поўны правал

У панядзелак на чэмпіянаце сьвету па хакеі зборная Беларусі правяла свой апошні паядынак. Наша каманда яшчэ напярэдадні пазбавілася шанцаў трапіць у плэй-оф, таму ў паядынку зь немцамі беларусы гулялі проста дзеля ўласна прэстыжу. Аднак зноў прайгралі: 5:6.

Такім чынам, зборная Беларусі захавала прапіску ў элітным дывізіёне, выйграўшы толькі адзін матч — у аўстрыйцаў (5:2), якія, між іншым, пакінуць групу наймацнейшых. Паглядзім, ці застанецца на пасадзе трэнэр каманды Курт Фрэйзэр.

**ЗП**




Мезін застанецца ў гісторыі беларускага хакею адным з найлепшых галкіпэраў.

СЯРГЕЙ ХАРЭЎСКІ

# Крымскія сюжэты

Прагучыць сырэна ў порце часам.
Кіпарысаў дрэмле ціхі сад.
Дрэмле Ялта, на крутых тэрасах
Льецца вішань белы вадапад.
Тут вясна асыпала ўсё цьветам
І цяжэй знайсьці ўчарашні сьлед.
Хоць над раньнім курганом паэта
Напісалі імя і санэт.

Максім Танк, *«Над магілай Багдановіча»*

## Ня наша Маша

Ці можна ставіцца паважна да гэтага краю адпачынкаў з бутафорскімі краявідамі? Тут і жабрацтва, і бруд, і боль, здаецца, не кранаюць гэтак глыбока. У іх проста ня верыцца, калі стаіш пад пальмамі — іх шапаткія лісты-вэеры тамака здаюцца несапраўднымі… Як і малпачка Маша, няўрымсьлівае вясёлае стварэньне, якое скача з пляча на плячо мінакоў, жвава засоўваючы свае маленькія лапкі, чорныя й скураныя, нібы пальчаткі, у кішэні разявакаў… Ня менш кемлівы яе гаспадар, гэткі ж порсткі й жулікаваты, тут жа суне вам пад нос лічбавы фотаапарат, у шкляным атворы якога вы бачыце сябе з малпаю. Малпа — зьлева… У Менску кожны, хто пабываў у Ялце, ведае тую Машу. І ў кожнага свая показка пра яе. Не зарыгінальнічаў. Цешыць, прынамсі, адно: Маша здаровая, порсткая й вясёлая.

## Наш паэт

Што ў Крыме сапраўднага? Хіба могілкі. Пасьля доўгіх бадзяньняў знайшоў-такі тыя, званыя ў народзе «старымі». Прыйшоў на Радуніцу на магілу Максіма Багдановіча. Для васількоў яшчэ ня час. Паставіў жоўты нарцыс.

У «Матэрыялах да біяграфіі Максіма» бацька паэта, Адам Багдановіч піша: «Месца абрана надзвычай няўдала: залевы і патокі з крутога схілу лёгка маглі размыць магілу. Я наняў вартаўніка, каб магілу ўмацаваць і ўпарадкаваць, пакінуў грошы гаспадыні, каб пасадзіць кіпарысы і куст ружаў, прасіў сачыць за гэтым двух знаёмых, у тым ліку і дачку майго саслужыўцы, асабістую знаёмую Максіма, але ці зроблена гэта — ня ведаю».

Месца для магілы Багдановіча насамрэч не адпаведнае беларускім уяўленьням пра добрае месца апошняга спачыну. Але іншых у гарыстым Крыме папросту не знайсьці… Пагатоў у 1917 г. Праз колькі часу і тут шчыравалі бязбожнікі, таму й першы крыж на ялцінскай магіле быў зьнішчаны, а на ягоным месцы паўстаў савецкі помнік з чырвонай зоркай, які і пратрымаўся да 2003 г. А ў 2003 г. на магіле паэта ўсталявалі мэмарыял работы скульптараў Лява і Сяргея Гумілеўскіх. Для крыжа месца тут так і не знайшлося…

## Нашы

На Радуніцу на тутэйшых могілках — тлум. Сьвятары расейскія, украінскія, армянскія… Адразу пры ўваходзе на могілкі трапляецца вялікая шыльдастрала «Максим Богданович». Дзякуй таму, хто парупіўся. Пасярод красавіка, пакуль не да канца распусьціліся тут дрэвы, між кіпарысаў відаць здалёк бел-чырвона-белае зіхценьне.

Крок становіцца ўпэўненым. Ля помніка расьце вялікая хваіна, на якой і ўмацаваныя бел-чырвона-белыя стужкі, сьцяг і бляшаная Пагоня.

На Максімавай магіле ўвіхаюцца землякі. Зь Ялты. Мыюць, мятуць, ставяць кветкі, сьвечкі. Сьпяшаюцца. Маўляў, зараз прыйдуць наступныя. Тыя, што тут во гэтыя сьцягі пачапілі й «Пагоню». «А я як Цімашэнку чую, дык у мяне мароз па скуры. Вядзьмарка… Нешта ў ёй такое сатанінскае…» За хвілінаў дзесяць перазнаёміліся, выпілі, закусілі. Не абышлося й бязь сьпеву рамансаў… Атрымаў адрасы, тэлефоны. Адна зь зямлячак, родам зь Петрыкаўшчыны, скончыла музычную школу й вучэльню ў Мазыры. Цяпер у Ялце выкладае музыку й сьпевы ў вучэльні. Пра посьпехі малых мазыранаў на дзіцячым Эўрабачаньні ня чула. На радзіме не была гадоў дзесяць. «Пагоню» ня любіць. Добра, што я памаўчаў. Рэдкая нагода пахваліць сябе самога. Наступных беларусаў, зь Севастопалю й Сімфэропалю, чакаць ня стаў. Няма моцы маўчаць…

## Ня нашы сонца, горы, мора

Выглядае, што наш паэт тут не самотны, дзякуй Богу. Урэшце, я ж прыехаў у Крым па сонца, горы й мора...

Сонца беларусы не ўважаюць за нейкую самадастатковую вартасьць. Яно мусіць выконваць для нас сваю работу — грэць нашыя целы, аціпляць нашыя агароды, асьвятляць нашыя шляхі. Рабіць сваю працу беларускае сонца мусіць акуратна, ашчадна, аднастайна.

Мо таму на бацькаўшчыне мы хаваемся ад зыркага сьляпучага сьвятла? Бо яно ж сваё, нікуды не падзенецца. А выпраўляемся куды на поўдзень, то падстаўляем сябе таму, купленаму, сонцу чым болей. Цешымся з часовага набытку. Але што ні кажы, нашае сонца і іхнае — розныя…

Горы, дарэчы, хоць адным радочкам, але згадаў кожны беларускі паэт сама меней ад часоў Багушэвіча. А ўжо ж колькі Міцкевічы, Адам і Кастусь, іх прыпаміналі!

І каму у тым прасторы
Ночка, дол, лясы і горы
У сьпевах кажуць — чэсьць, хвала?

Прага гораў — для беларуса не азартная пагоня за нечуванымі ўражаньнямі. Для нас горы — сымбаль недасяжнае дасканаласьці стварэньня. Рэч, што існуе сама сабою, без аніякае мэркантыльнае карысьці…

А мора нагадвае нам пра дзіцячыя летуценьні. Мы зьмяняемся, а мора застаецца тым самым. Неабсяжным. Прыгожым. І чужым. Апошняга слова не напісаў бы, каб хоць краем наш край выпінаўся ў марское шумавіньне. Мора ў нас няма. Ёсьць толькі балоты. І паэзія.

## Наш паэт

Сухоты, невылечныя тады, змусілі Багдановіча зьехаць у Крым. Зімой 1917 г. ён апошні раз прыехаў у Ялту. А 25 траўня паэт пайшоў з жыцьця. Цяпер на месцы дома, дзе спынілася сэрца Багдановіча, пабудаваная санаторыя «Ялта». На бэтонным гмаху ваеннага расейскага клюбу — мэмарыяльная табліца ў гонар беларускага паэта. Вось жа, здавалася, на памяць са школы ведаем ягоныя апошнія словы:

У краіне сьветлай, дзе я ўміраю
У белым доме ля сіняй бухты…


ВЕРАНІКА ДЗЯДОК

Але азірнуўшыся, з наіўным подзівам пераканаўся: так, адсюль насамрэч раскрываецца ідылічная панарама на сінюю-сінюю бухту, да якое зьбягае калянада старых кіпарысаў. Прыгожа, як у турыстычным буклеце. Ці выходзілі вокны з пакою Багдановіча на мора? Невядома. Але калі стаць сьпінаю да мэмарыяльнай табліцы, то ўбачым шыкоўны палац эміра Бухарскага Сеід Абдул Ахан-хана, узьведзены паводле праекту архітэктара Тарасава ў 1903 г.

Вялікую дзялку зямлі эмір набыў яшчэ ў 1898 г., заклаў тут шыкоўны парк, дамы для прыслугі, гасьцей. І назваў свой ялцінскі маёнтак Дылькісо — «Чароўнае». Бадай, акурат гэтым палацам і давялося любавацца Багдановічу ў свае апошнія дні… Ці быў ён самотны? Гледзячы на шыкоўную сачыстую маўрытаніку палаца Сэід Абдул Ахан-хана, адказаць няцяжка. Між іншым, апроч уласнае рэзыдэнцыі, эмір пабудаваў у Ялце й шпіталь, які падарыў гораду….

Пасьля сьмерці Багдановіча, у 1917 г. палац Бухарскага эміра ў Ялце нацыяналізавалі й разрабавалі. Нашчадак трону, эмір Саід Мір Алім-хан, зьехаў у родную Бухару й колькі гадоў ачольваў антырасейскі супраціў, пакуль ня змушаны быў уцячы ў Кабул. Але да самае свае сьмерці фінансаваў і каардынаваў змаганьне з бальшавікамі.

Вось жа я залез цераз плот у палацавы парк Дылькісо ня проста зь любові да экзотыкі. Менавіта гэты палац мо апошняе, што бачыў у жыцьці зямным Максім Багдановіч. Ягоны ж белы дом, ля сіняй бухты, стаяў акурат насупраць. Цяпер у палацы балююць расейскія вайскоўцы — пра гэта я даведаўся, калі пераскокваў цераз белы плот, уцякаючы ад дужых ахоўнікаў з дзьвюхгаловымі арламі на рукавах…

Аддыхаўшыся, згадаў, што пару гадоў таму імя апошняга эміра Бухары, уласьніка гэтага палацу, згадвалася ў… крымінальнай хроніцы. Ягоны шыкоўны залаты кінжал, інкруставаны смарагдамі й туркусам, быў скрадзены на выставе ў… каліфарнійскім Лонг Біч. А пасьля знойдзены! У… пушчы з-пад абутку ў тэлефоннай будцы «ў краіне сьветлай…».

## Ня наш сабор

Варта ў Ялце адведаць і сабор Аляксандра Неўскага, дзе ў траўні 1917 г. адпявалі 26-гадовага паэта. Тут быў і ягоны бацька. Цяпер храм зарос пальмамі. Лепшы выгляд на яго… зьверху, зь люлькі канатнага трамвайчыка, што вязе з пляжу на гару. Зрэшты, і хлуду ўсялякага зьверху відаць багата.

Пампэзны расейскі сабор пабудавалі ў гонар цара Аляксандра ІІ, якога забіў 1 сакавіка 1881 г. наш герой-пакутнік Ігнат Грынявіцкі.

Першы праект храму распрацаваў у 1889 г. архітэктар Эшліман, але 1 сакавіка 1891 г., да дзясятае гадавіны сьмерці цара, заклалі сабор паводле праекту дойлідаў Краснова і Церабнёва (яны ж, дарэчы, пабудавалі й тутэйшы ялцінскі рыма-каталіцкі касьцёл). Першы камень у падмурак заклала сама імпэратрыца Марыя Хведараўна.

Сабор атрымаўся двух'ярусным, з утульнымі адкрытымі галерэямі й шатровым ганкам. Абразы для храму выраблялі ў Мсьцёры Ўладзімерскай губэрні. А 11 званоў адлівалі ў Маскве. Галоўны звон важыў ажно 428 пудоў. Асьвячэньне сабору адбылося ў 1902 годзе… Натуральна, храм вельмі спадабаўся бацьку паэта, Адаму Багдановічу…

Між іншым, тут у 1918 г. адпявалі жонку Ф.М.Дастаеўскага, Ганну Рыгораўну. Але неўзабаве і гэты храм закрылі й разрабавалі бальшавікі…

## Нашай гісторыі каліва

Беларусы стала жывуць у Крыме з XVIII ст. Япіскап Гермаген у «*Таврической епархии*» згадвае, што сярод першых ваенных пасяленцаў у Крыме пасьля яго захопу расейскімі акупантамі ў 1783 г. «*были частью белорусы*». Расейскія сатрапы гвалтам за-

**Працяг на старонцы 26.**

# Крымскія сюжэты


ВЕРАНІКА ДЗЯДОК

**Палац эміра Бухарскага, які Максім бачыў з вакна.**

**Працяг са старонкі 25.**

возілі сюды беларусаў з толькі захопленых імі ваяводзтваў Рэчы Паспалітае цэлымі вёскамі: напрыклад, у вёску Азамат (!) Феадасійскага павету, што хапануў сабе генэрал-аншэф М. Кахоўскі, у кастрычніку 1788 г. прывезьлі ягоных прыгонных беларусаў з Магілёўскага намесьніцтва — былых жыхароў вёсак Паўловічы, Лазовіцы, Ракіты з Клімавіччыны. Беларускае селішча атрымала назоў Васільеўка (ёсьць яно й да сёньня).


ВЕРАНІКА ДЗЯДОК

**Царква у якой адпявалі Багдановіча.**

Хоць самахоць сюды ня ехалі, але зямля тут шчодра палітая беларускаю крывёю. Ёсьць тутака, «пад Сьвістопалям», як казалі ў Беларусі тады, помнік славутаму беларусу Аляксандру Казарскаму, герою расейска-турэцкай вайны 1828—1829 гг., камандзіру легендарнага брыга «Меркурый». Помнік Казарскаму пастаўлены яшчэ ў 1831 г.

У Севастопалі ж, на жаўнерскіх Братніх могілках, пахаваныя тысячы нашых землякоў, якія загінулі пры абароне Севастопалю ў 1854—1855 гг. Сярод абаронцаў Севастопалю, воляю лёсу, між іншым, апынуўся й маладзенькі капітан Ян Баляслаў Луцкевіч, бацька Івана й Антона.

Шануюць у Крыме й беларуса пісьменьніка-рамантыка Аляксандра Грына, сына ўдзельніка паўстаньня 1863 г. Ён доўга жыў тут, натхняючыся тутэйшай экзотыкай…

Паводле перапісу 1897 г. у Крыме, у графе *«белоруссы»* значылася 2058 чалавек.

А вось як выселілі крымчакоў-татараў, то аматараў пажыць хораша і ў цяпле значна паболела. Паводле перапісу 1989 г., у Крыме жыло ажно 50054 беларусаў, то бок 2% ад насельніцтва гэтага далёкага краю. Для параўнаньня: да трагічнае дэпартацыі крымчакоў, у 1939 г., у Крыме жыло толькі 4900 беларусаў, альбо 0,55%.

## Ня наша гісторыя

Што ёсьць сапраўднага ў Крыме, дык гэта ўсё «нярускае». Пахі, стравы, норавы. Уласна колішнія карэнныя жыхары складаюць цяпер больш як 12 адсоткаў насельніцтва. Але, апроч крымскіх татараў, сёньня тутака ж жывуць тысячы азэрбайджанцаў, чачэнцаў, інгушоў, туркаў… І калі цяпер у тутэйшых мястэчках надыходзіць час намазу, разумееш, што ты не ў Эўропе… Часта можна ўбачыць мэмарыялы ў памяць татараў-крымчакоў, якія загінулі на чужыне, у тузе па сваёй радзіме. Крымскія гарады штораніцы абуджае азан з адбудаваных мінарэтаў…

Далей ад тлумнага курортнага берагу, у горы, пачуцьцё сапраўднасьці толькі расьце.

На перавале — белы сьнег, зялёная гарбата.. Вярблюды, авечкі, коні. Горы


ВЕРАНІКА ДЗЯДОК

**Чуфут Кале: горад, якому 7 тыс. гадоў.**

мурам вакол. У вусьцішна змрочных цясьнінах сьнег.

> Tam czy Allach postawił ścianą morze lodu?
> Czy aniołom tron odlał z zamrożonej chmury?

За пераваламі, між Чуфут-Кале й Бахчысараем, ляжыць Ясафатава даліна. У XIX ст. сюды прыяжджала шмат мастакоў, маляваць «палестынскія» краявіды. І Іванаў сюды езьдзіў, і Крамской, і Ге, і наш Рушчыц.

Тут засталіся сьведчаньні чалавечага жыцьця за сем тысячаў гадоў. Таўраў зьмянілі скіфы, аланы, караімы, татары. А цяпер — нікога. Нейкія драбнюткія казуркі й шыкоўны дыван прыўкрасных горных кветак. Кавалкі «Крымскіх санэтаў» выскокваюць з памяці, як тосты з тостэру… Але дарэчы.

> Stómy! — jack cicho! — słyszę ciągnące żurawie,
> Których by nie dościgły śrenice sokoła;
> Slyszę, kędy się motyl kołysa na trawie;
> Kędy wąż ślizką piersią dotyka się zioła.

Што ўражвае тут болей? Адноўлены татарскі Бахчысарай, дзе гадоў дваццаць таму гаспадарылі бамжы й сабакі, ці мёртвая й чыстая вусьціш закінутага Чуфут-Кале, якому сем тысячаў гадоў? Пэўна, каляіны ад колаў, што адпаліравалі гэты нішчымны вапняк… За сем тысячаў гадоў… Усё нібы марнае: пакуты, працы, песьні. Зьніклі бяз знаку дзясяткі народаў. Але калі ўжо й наш лёс такі, то я не хачу быць нікім іншым, як сабою…

## УЛАДЗІМЕР ЛОБАЧ

МУЖЧЫНСКАЕ

Стаў сьвет такі — суцэльны дэкаданс
І ты, абраўшы Край і Мову
Як неадменную жыцьцёвую ўмову,
Аўтаматычна пераходзіш у рэзыстанс.

Твой супраціў — ня казка, не вайна
Зь дзіцячых рамантычных кніжак,
А праца жыльная, без усялякіх зьніжак,
На ворыве зь відна і да відна.

Твой плён ня станецца правінай —
У снах ухвальна пасьміхнецца дзед,
І будзе перамога пасьля бед —
Радзіма вольная і любая жанчына.

## ХВЕДАР САМОТНЫ

* * *

*зіма*мароз*сьнег*
*з*табой*не*сустрэцца*
*дашлі*sms*
*каб*я*змог*сагрэцца*

## ІГАР ВЕСЯЛУШКА

* * *

Мой тата — ахоўнік.
Працуе ў калгасе.
Пільнуе кароўнік.
Заўсёды пры мясе.

А мама на касе —
Гандлярка хароша.
Як тата пры мясе,
То мама пры грошах.

Я хлопчык сьвядомы,
Урокі вучу.
Пра тое, што дома,
Заўсёды маўчу.




**Капэрта з «Нашай Нівай», дасланая палітвязьню Андрэю Клімаву ў СІЗА, вярнулася ў рэдакцыю.**


У цырульні
Абрыдла старая фрызура! Самы час завітаць у цырульню.
Добры дзень!
Спачатку памыем валасы...
Расчэшам іх грабеньчыкам ды падрэжам нажніцамі...
Накруцім валасы на бігудзі...


Нанясем фарбу...
Пакуль валасы сушацца, пачытаю цікавы часопіс ...
Валасы высахлі! Цяпер трэба іх выпрастаць...
Новая фрызура гатовая!
Капітан Танака ©
http://www.tanakaland.org




## ВЫСТАВА

**Людвік Асецкі**

У Палацы мастацтваў адчынілася выстава твораў Людвіка Асецкага. Ягоная творчасьць належыць да сапраўднае клясыкі беларускага мастацтва. Асецкі — вядомы графік, чый творчы шлях пачаўся пасьля вайны. Таму многія нізкі ягоных твораў — унікальны летапіс паваеннае Беларусі.

Асобную частку творчага даробку мастака складаюць графічныя аркушы на матывы беларускае літаратуры. Перадусім, гэта ілюстрацыі да твораў Купалы й Коласа.

Знаёмства са сьветам Асецкага — гэта знаёмства з вычуваньнямі й эстэтыкай клясычнага «суворага стылю», зь якога вырасла наступнае пакаленьне беларускіх творцаў. Клясыка.

**СХ**

**Мае казкі**

**У М-Галерэі Інстытуту імя Гётэ ў Менску** (вул. Фрунзэ, 5) **14 траўня а 18-й** адчыняецца выстава Юр'я Алісевіча «Мае казкі». Ю.Алісевіч афармляў казкі Андэрсана і Пэро, славацкія, беларускія, італьянскія і расейскія казкі.

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# «Чалавек-павук 3»

**Чалавек-павук 3: Вораг у адбітку** (Spider-Man 3)

ЗША, 2007, каляровы, 139 хв.

**Рэжысэр:** Сэм Рэймі.

**Жанр:** Кінакомікс.

**Адзнака:** 5,5 (з 10).

Самы дарагі фільм сучаснага кінапракату.

Ціхмяны фатограф Пітэр Паркер — па сумяшчальніцтву Чалавек-павук — змагаецца з Гоблінам-малодшым, Чорнай Сьмерцю і Пясочным чалавекам. Але галоўным ворагам Чалавека-павука становіцца ён сам. Іншапляранэтная нафта-паразыт фарбуе героя ў чорны колер і штурхае да помсты.

Трэцяя частка кінакоміксу прэзэнтуе дарагія адмысловыя эфэкты: паветраную сутычку з Гоблінам, атаку Пясочнага чалавека, палёты бэтонных плітаў і вышталцоную харэаграфію бою ў мэтро. Але на дзьвюхгадзінны фільм такіх эпізодаў усяго чатыры.

У перапынках паміж коміксавай эксцэнтрыкай героі занятыя сямейнымі праблемамі — каханьнем і сяброўствам. Побыт «батаніка» Пітэра Паркера пададзены зь лёгкім гумарам: дурныя зламаныя дзьверы, нэрвовы рэдактар, услужлівы афіцыянт. А «змаганьне героя з самім сабой» выглядае зьменай іміджу.

Ціхоня апранае чорны прыкід, развучвае фрывольныя жэсты і робіць чубок пад Адольфа Гітлера. Але зло мусіць быць пераадолена дабром: касьцельны звон пазбаўляе ад нафты-паразыта, былы вораг прыйдзе на дапамогу, а Павук вырашае даравац дый ня помсьціць. Маральныя высновы разжаваныя й пададзеныя на сподачку (што ня ёсьць заганай для коміксу), расквечаныя атракцыёнамі — і ўрачыста ўзнагароджаныя амэрыканскім сьцягам.

Стужка Сэма Рэймі занадта «вылізаная» (без прафэсійных няправільнасьцяў, якія чапляюць) і занадта вялікая — што прымушае засумаваць. Але глядзець яе варта толькі на вялікім экране — аб'ёмны гук і яскравыя колеры тады не здадуцца нудой.

**Андрэй Расінскі**

## АДБОР НА «БАСОВІШЧА»

Пачаўся збор заявак ад гуртоў, якія хочуць узяць удзел у рок-фэсьце «Басовішча». Падаць заяўку можа любы гурт, які грае «жывую» музыку.

Сканчэньне прыёму заявак — 28 траўня

Патрабаваньні да гуртоў:
— наяўнасьць як мінімум адной запісанай песьні па-беларуску на CD або ў электронным выглядзе (MP3, WAV, WMA);
— наяўнасьць 20-хвіліннай канцэртнай праграмы па-беларуску;
— наяўнасьць ва ўсіх музыкаў гурту агульнаграмадзянскага пашпарту, дзейнага прынамсі да лістапада 2007 г.;
— гатоўнасьць музыкаў у кароткі тэрмін паставіць дазвольныя штампы ў пашпарты для выезду ва ўсе краіны сьвету.

Заяўкі павінны ўтрымліваць:
— запіс адной (ці болей) песьні на беларускай мове;
— кароткую інфармацыю пра гурт;
— кантактны тэлефон адказнай асобы ў гурце.

Заяўку можна падаць:
— праз электронную пошту на адрас bas@generation.by;
— праз звычайную пошту: 220050, Менск, Галоўпаштамт, Даша Слабчанка (да запатрабаваньня);
— з рук у рукі (папярэдне тэлефануйце: 113-09-08 701-78-30).

## ІМПРЭЗЫ

**Катлярчук у Менску**

**17 траўня ў дольнай залі Чырвонага касьцёлу** пройдзе прэзэнтацыя 2-га выданьня кнігі Андрэя Катлярчука «Швэды ў гісторыі і культуры Беларусі». Са Стакгольму спэцыяльна прыедзе аўтар. Будзе швэдзкі пасол Стэфан Эрыксан, іншыя цікавыя людзі. **Пачатак а 18-й.**

**Фэстываль моладзевай журналістыкі ў Горадні**

Фэстываль моладзевай журналістыкі «Твой стыль» пройдзе **18 — 20 траўня ў Горадні**. Удзельнікаў імпрэзы, прымеркаванай да 10-годзьдзя праекту «Школа маладога журналіста», чакаюць майстар-клясы вядомых журналістаў, разнастайныя прэзэнтацыі, канцэрты, сустрэчы зь цікавымі людзьмі. Для выпускнікоў праекту (а іх ужо каля 200) гэта яшчэ і выдатная магчымасьць сустрэцца з «аднакурсьнікамі». Каб узяць удзел у фэстывалі, трэба запоўніць анкету-заяўку і даслаць на адрас: вул.Будзённага, 48а-11, Горадня, альбо на факс (0152) 75-71-72, альбо на e-mail: treciseKtar@yahoo.com (з пазнакай — «Фэстываль»).

**Просты хлопец Бульбашэўскі вырашыў стаць першым беларускім супэрмэнам Бульбманам. Яму дапамагае мудры парсюк Тарас. Даверлівага хлопца спрабуюць ублытаць у крымінальную справу...**




МАЛЯВАЎ ЛЯВОН ВОЛЬСКІ

ЗА БЕЛАРУСЬ!

# Азаронку набілі пысу

Новымі скандаламі абрастае конкурс «Эўрабачаньня», дакладней, беларускі ўдзел у ім. Як паведамляе інтэрнэт-сайт news.mail.ru, пасьля першай рэпэтыцыі Дзьмітрыя Калдуна паспрачаліся сябар і прадусар сьпевака Філіп Кіркораў і кіраўнік беларускай дэлегацыі Юры Азаронак. І Кіркораў, ня доўга думаючы, даў моцную поўху намесьніку старшыні БТ. Азаронак узначальвае беларускую дэлегацыю на эўрапейскім поп-конкурсе.

Нібыта справа была ў артысьце з кіркораўскай падтанцоўкі, што абслугоўвае Калдуна. Танцор прыхварэў, і прадусэр хацеў адправіць яго ў бальніцу. А Азаронак ня даў сваёй машыны (з дэлегацыі ён адзін мае ў распараджэньні колы).

Мінулае выкарыстаньне расейскіх грошай для забесьпячэньня беларускага ўдзелу ў «Эўрабачаньні» (Ліка Агурбаш) прывяло да правалу. Сам Кіркораў у свой час таксама выступіў на «Эўрабачаньні» бяз посьпеху.

Калісьці Азаронак ужо зарабіў адну смачную поўху — ад Міколы Статкевіча, які ўрэзаў рэжысэру за фільм «Дзеці хлусьні», у якім той таптаўся па беларускім нацыянальным руху, гістарычных сьцягу й гербу.

**МБ**

Віншуем Марыю Вайцяшонак зь юбілеем.

Рэдакцыя

## СТО ГАДОЎ З ВАМІ

Мінск. Забастоўка ў друкарні Дворжаца скончылась за адзін дзень. Усё, што хацелі рабочыя, споўнена.

**«Наша Ніва» №19, 1907**



**Пуцін вострыць кіпцюры. Карыкатура швэдзкага мастака Рыбэра Гансэна перамагла на конкурсе «World Press Cartoon».**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### БЕЛАРУСКІ САДОК

**Шукаем дзетак-дашкалятаў** для стварэньня беларускіх групаў зь верасьня на захадзе Менску (раёны Красны Бор—Сухарава—Захад), магчыма, ясельная і садаўская разнаўзроставая групы. Далучайцеся! З намі можна зьвязацца па тэл. 183–84–19, Лебедзі. Lebiedz@tut.by

### КАНТАКТЫ

**30 траўня, 14.15, суд Савецкага** раёну (Лагойскі тракт, 3). Прыходзь на суд па справе маладафронтаўцаў — падтрымай беларускую моладзь! Якава 4:7! Брат

### КНІГІ

**Прадам поўны** збор твораў У.Караткевіча ў 8 тамах, Тлумачальны слоўнік беларускай мовы ў 5 тамах і іншыя каштоўныя і цікавыя беларускамоўныя выданьні. Т.: 288–05–44. Яўген

### ПРАЦА

**Дзяўчына-філялягіня** шукае любую працу, зьвязаную з тэкстамі. Вялікі вопыт працы. Т.: 174–98–91

**Філёляг** шукае працу. Т.: 294–13–38. Сьвятлана

### СЯБРОЎСКАЕ ПАДАРОЖЖА

**Зьміцер Касьпяровіч запрашае** ў сяброўскае падарожжа па маршрутах: 20.05 «Пуцявінамі Драздовіча»: Гарадзец–Лужкі–Германавічы–Мёры–Двор Дзедзіна–Ідолта–Лявонпаль. 25.05–28.05: Торунь–Хелмна–Добжынь. Т.: 292–54–58, 622–57–20, 509-12–16, 110–19–28.




# А ты падпішыся!

**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,**
проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Адначасова Рэдакцыя зьвяртаецца з просьбай ахвяраваць на выданьне. Дэталі — **старонка 17.**


## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Зьмітру з tut.by**. Пішучы на тэмы культуры й канцэртаў, цяжка канкураваць зь людзьмі са спэцыяльнай музычнай адукацыяй. Калі Вы навучаецеся ў БНТУ, было б натуральна, каб Вы пісалі на тэмы навукі й тэхналёгій. Во пра гэта нагвалт трэба, каб хто пісаў па-беларуску.

**Зьмітру Х. з tut.by**. Ня толькі аўтар прачытаў, а, найхутчэй што, тэкст будзе апублікаваны, праўда, са скаротамі. Ён ужо рыхтуецца да друку. Паколькі электронныя лісты ніколі не зьнікаюць (а калі зьнікаюць, дык адпраўніку прыходзіць паведамленьне пра гэта), мы ня маем звычкі пацьвярджаць атрыманьне. Зразумейце, што часам штодзённа Рэдакцыя атрымлівае некалькі соцень допісаў, водгукаў, матэрыялаў, вестак.

**Юрасю з gmail.com.** Розьніца ў ацэнках ідзе папросту ад розных оптык. Наш кар. знаходзіўся ў адным месцы, Вы — у другім. Пра «Бунт» таксама пішам, і нямала. Ніводная Ваша справа не змарнуецца для Бога і людзей.

**Сацыял-дэмакрату з mail.ru.** Пэрыядычна ў тых самых тэрмінах і з падобнымі высновамі нам ставяць прэтэнзіі прадстаўнікі ці лідэры палітычных сілаў, альтэрнатыўных Вашай. (Да гонару Мілінкевіча, гэты чалавек ніколі не выстаўляе прэтэнзій да СМІ.) Гэта для нас толькі пацьвярджае, што «Наша Ніва» застаецца газэтай, залежнай толькі ад сваіх прынцыпаў.

**Ігару Ф. з tut.by.** Трэба зь цьвярозым энтузіязмам рабіць тое, што нам падказвае сумленьне, і рабіць так доўга, як прыйдзецца.

**В-ту**. «Чорны блакіт» і «белая чырвань» — ад перабору эмоцый верш траціць сэнс.


Наша Ніва
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
фотарэдактар — Арцём Лява
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**



© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.



12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102–71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2239. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 09.05.2007.
Замова № 2504.
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102–71.